Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

5 СНЕЖНЯ 2017 г. АЎТОРАК №234 (28598)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Як звяздовец рыхтаваўся да службы

СТАР. 5



Чым шкодныя супраць-галалёдныя рэагенты?

СТАР. 8

ЦЫТАТА ДНЯ



**Ірына КАСЦЕВІЧ,** міністр працы і сацыяльнай абароны:

*«У 2018 годзе плануецца выйсці ў сярэднім (пры кансерватыўным сцэнарыі на развіццё беларускай эканомікі) на 700 рублёў зарплаты ў бюджэтнай сферы. Калі, вядома, эканоміка забяспечыць адпаведны рост, то, я думаю, 760 рублёў у сярэднім у бюджэтнай сферы мы зможам забяспечыць. Хачу нагадаць, што з 1 снежня 2017 года зарплаты, у залежнасці ад разрадаў, у сярэднім павысіліся на 7%. У катэгорый работнікаў, якія тарыфікуюцца з 1-га па 9-ы разрад, у сярэднім зарплата ўзрасце на 9—15% (ці BYN26—35), а з 9-га па 17-ы разрад — да BYN24. Павышэнне арганізавана так, што ў большай ступені зарплаты вырастуць менавіта ў нізкааплатных катэгорый работнікаў, якія тарыфікуюцца з 1-га па 4-ы разрад. У цэлым павышэнне закране каля 88% бюджэтнікаў».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 05.12.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 2,0227 | ▲ |
| Еўра | 2,3960 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0343 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0744 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Са свайго агарода. Па рэцэптах «Звязды»



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У адной з самых першых кулінарных кніг была парада: «Калі да вас прыйшлі госці, спусціцеся ў склеп і...» Хто-хто, а Марыя Фёдараўна ПЯШЭВІЧ з вёскі Юркевічы Жыткавіцкага раёна з пустымі рукамі адтуль не вернецца, бо чаго там толькі няма: грыбочкі, гурочкі, памідоры, кампоты, сокі, засолы... Усё сваё, прыгожае, смачнае і, што важна, прыгатаванае па рэцэптах з любімай «Звязды», якую сужэнцы Пяшэвічы выпісваюць не адно дзесяцігоддзе. І іншым раяць.

■ Сацыяльны клопат

## ПАДВОДНЫ МАСАЖ І АСАБІСТЫ ТЭРАПЕЎТ

### Як лечаць вяскоўцаў, якіх дзеці на зіму забіраюць у вялікі горад

**Удакладніць дыягназ, скарэкціраваць лячэнне або аформіць інваліднасць старому, якога дзеці прывезлі ў горад, каб перачакаць зімовыя халады, значна прасцей, чым на вёсцы. Тут больш магчымасцяў, спецыялістаў і апаратыўнасці. Якія паслугі атрымліваюць вяскоўцы ў сталіцы і як іх успрымае персанал медыцынскіх устаноў, пацікавілася карэспандэнт «Звязды».**

### НІ РАЗУ НЕ АДМОВІЛІ

Мінчанка Людміла прывозіць маму зімаваць у Мінск ужо восьмы год. Тры гады абслугоўваліся ў паліклініцы ў Малінаўцы, пяты год — у Шабанах.

— Я вельмі задаволеная, як ставяцца да мамы. Ёй ужо даўно мінула 80, і ні разу яшчэ не здарылася, каб мне ўрачы ў нечым адмовілі, — дзеліцца яна вопытам.

Кожны год Людміла піша заяву, каб працягнулі абслугоўванне ў паліклініцы. Кажа, прымаюць бабу Лізу без праблем усе спецыялісты. А калі хуткую дапамогу выклікалі, на наступны дзень участковы тэрапеўт прыходзіла.

— Вось у мінулую пятніцу хадзілі з мамай у паліклініку. Нам спачатку сказалі пасля лета прайсці ўсіх урачоў. А калі тэрапеўт даведалася, што мама ў жніўні ляжала ў мясцовай бальніцы, дазволіла прынесці эпікрыз і выпіску па аналізах адтуль, каб не хадзіць дарэмна па кабінетах.

СТАР. 4

■ «Звязда» даследуе праблему

## Трамвайная «рулетка»

### На вялікай сталічнай вуліцы склалася вельмі вострая сітуацыя па колькасці збояў работы грамадскага транспарту



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Рэйкавыя віды транспарту маюць адну асаблівасць — іх манеўранасць або вельмі істотна абмежаваная, або адсутнічае ўвогуле. Таму любая перашкода на пуцях аўтаматычна азначае тое, што іх работа будзе з высокай доляй верагоднасці сарвана.**

Сталічная магістраль Якуба Коласа мае ў сваім распараджэнні толькі адзін від грамадскага транспарту — трамвай. На ім тысячы пасажыраў са шматпавярховых кварталаў уздоўж вуліцы Якуба Коласа, Лагойскага тракта і мікрараёна Зялёны Луг штодзень дабіраюцца да метро, на працу, вучобу, у паліклініку, на чыгуначны і аўтавакзал...

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ГАЗАВУЮ ПЛІТУ ЦІ МІКРАХВАЛЁЎКУ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2018 года!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# КАЛІ ЁСЦЬ ПОПЫТ...

## Прэзідэнт правёў нараду па пытаннях вытворчасці і рэалізацыі тытунёвых вырабаў

**Дадзеная сустрэча адбылася па дзвюх прычынах, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Першая — гэта сур'ёзны попыт на адпаведную прадукцыю за мяжой. «Ясна, што гэта падакцызны тавар, што бюджэт атрымлівае велізарныя сродкі. У гэтым годзе мы чакаем 1 мільярд беларускіх рублёў, гэта значыць 0,5 мільярда долараў. Гэта вялікія падатковыя паступленні», — сказаў кіраўнік дзяржавы.**

Прэзідэнт не ўхваляе таго, калі нехта ўжывае тытунёвыя вырабы або злоўжывае алкаголем. Аднак Аляксандр Лукашэнка згодны, што гэтая галіна ў Беларусі развіваецца актыўна не толькі ў сувязі з попытам: «У апошні час, як мяне інфармуюць, у нас попыт на гэты тавар стабілізаваны і росту ніякага няма. Гэта ўжо добра».

Іншая прычына нарады — прапановы некаторых беларускіх бізнесменаў па ўдасканаленні вытворчасці і рэалізацыі такой прадукцыі. Па словах кіраўніка дзяржавы, прадстаўнікі бізнес-супольнасці сцвярджаюць, што патэнцыял галіны не вычарпаны.

— Да мяне нават у апошні час звярнуліся замежныя прадпрымальнікі наконт таго, што нашы прадпрыемствы не хочуць прадаваць прадукцыю на экспарт. Ёсць вялікія нішы, нават у Еўрапейскім саюзе. Яны нам выгадныя. Таму, калі ёсць попыт, трэба прадаваць тытунёвыя вырабы. Не прададзім мы, прададуць іншыя. Рынкі будуць занятыя, — сказаў Прэзідэнт. Ён таксама дадаў, што выніковае рашэнне павінна адказваць выключна інтарэсам дзяржавы.

У параўнанні з паказчыкамі 2000 года вытворчасць тытунёвых вырабаў у Беларусі ўзрасла ў тры разы. Экспарт павялічыўся больш чым у 16 разоў, імпарт скараціўся больш чым у 25 разоў, а ўнутраны рынак больш чым на 95% забяспечваецца айчыннай прадукцыяй. Такія даныя прывёў віцэ-прэм'ер Міхаіл Русы.

Па выніках нарады ён таксама расказаў пра тое, што зараз абмяркоўваецца стварэнне адзінай таваразправоднай сеткі ў тытунёвай сферы. Зараз, калі буйная замежная кампанія хоча прыйсці на беларускі рынак, то яна павінна размясціць тут сваю вытворчасць, запусціць лінію і перадаць яе ва ўласнасць фабрыкі. Па такім прынцыпе асноўныя транснацыянальныя кампаніі інвеставалі прыкладна 26 мільёнаў долараў у развіццё свайго сектаральнага бізнесу.

— На сённяшні дзень мы разгледзелі новы крок — у гэтую сферу ўваходзіць і бізнес. Ствараецца адзіная таваразправодная сетка, якая будзе займацца рэалізацыяй тытунёвай прадукцыі як на ўнутраным рынку, так і на знешнім, — адзначыў віцэ-прэм'ер. — Інвестар (у якасці якога выступіць прыватная кампанія «Энерга Оіл») прывядзе інвестыцыі прыкладна ў 60 мільёнаў долараў — 122 мільёны беларускіх рублёў. Павялічацца магутнасці Гродзенскай тытунёвай фабрыкі.

Падобны крок прынясе значны прыбытак. Так, па мінімальных разліках рэалізацыя праекта за чатыры гады дасць 205—210 мільёнаў беларускіх рублёў дадатковых паступленняў, а патэнцыйна — да 400 мільёнаў. Нарматыўны дакумент будзе падрыхтаваны так, каб са студзеня 2018 года гэты праект пачаў паэтапна развівацца. «Завершыцца ён на першым этапе ў 2020 годзе. Далей будзем глядзець. Хоць мы ўсе гэтыя пытанні будзем суправаджаць. Гэта сур'ёзны крок да таго, каб у такія сферы ўваходзіў і бізнес. Але кантроль дзяржавы будзе вельмі сур'ёзны ў любым выпадку», — сказаў Міхаіл Русы.

Па словах віцэ-прэм'ера, цяпер вядзецца гаворка пра тое, каб інвестар устанавіў яшчэ дзве лініі, кожная коштам па 10 мільёнаў долараў. З іншага боку, дзяржава ў якасці ўласніка таксама павялічвае вытворчыя магутнасці. Некаторы час таму ўвялі адну лінію, у планах — устанавіць некалькі. Попыт за мяжой на айчынную прадукцыю ўзрос, таму вытворчасць працуе кругласутачна. Аднак пастаўляць на экспарт неабходна аб'ём, не агаляючы ўнутраны рынак, на сёння немагчыма.

**Па матэрыялах БЕЛТА.**

■ Меркаванне



# ЯК ПРАВІЛЬНА КІРАВАЦЬ ІНТЭРНЭТАМ?

**4-я Сусветная канферэнцыя па кіраванні інтэрнэтам праходзіць з 3 па 5 снежня ва Учжэні ва Усходнім Кітаі. Галоўная тэма канферэнцыі — развіццё лічбавай эканомікі, садзейнічанне адкрытасці і агульнадаступнасці — сумеснае стварэнне супольнасці адзінага лёсу ў кіберпрасторы. На ёй абмяркоўваюцца пытанні лічбавай эканомікі, перадавых тэхналогій, інтэрнэту і грамадства, кіравання кіберпрасторай, абменаў і супрацоўніцтва.**

Канферэнцыя арганізавана сумесна Дзяржаўнай канцылярыяй інтэрнэт-інфармацыі КНР і народным урадам правінцыі Чжэцзян. Актуальнасць мерапрыемства заключаецца ў тым, што новая інавацыйная рэвалюцыя развіваецца беспрэцэдэнтнымі тэмпамі ў лічбавую эпоху, якая была б немагчымая без развіцця інтэрнэту. Розныя індустрыі трансфармуюцца з-за прарываў у штучным інтэлекце, біятэхналогіях, БПЛА, робататэхніцы, інтэрнэце рэчаў, аўтаматычных кіраваных аўтамабілях, нанатэхналогіях і ў іншых галінах.

На канферэнцыю прыехалі прадстаўнікі 430 высокатэхналагічных кампаній з розных краін свету. Акрамя гэтага, у ёй бяруць удзел больш за 1,5 тыс. экспертаў, прадстаўнікоў кітайскіх і замежных дзяржструктур, міжнародных арганізацый і навукова-даследчых цэнтраў.

Месца правядзення мерапрыемства таксама навявае пэўныя разважанні пра перспектывы інтэрнэту, таму што менавіта Кітай у XXI стагоддзі замест ранейшага лідара — ЗША, становіцца цэнтрам усяго, што звязана з навінкамі ў інтэрнэце і яго найбольш маштабным выкарыстаннем. Капіталізацыя найбуйнейшых інтэрнэт-кампаній Кітая Tencent і Baidu перавышае ў кожнай 300 мільярдаў долараў. Гэта яшчэ менш, чым у такіх амерыканскіх кампаній як Apple або Facebook, але дынаміка іх развіцця прымушае меркаваць, што неўзабаве сітуацыя зменіцца на карысць гэтых і астатніх кітайскіх кампаній. Урад Кітая актыўна працуе над гэтай і іншымі задачамі. У прыватнасці, актыўна ўкараняецца новы пратакол IPv6 для развіцця інтэрнэт-індустрыі. Плануецца, што да канца 2025 года ў Кітаі сеткі, праграмы і тэрміналы будуць здольныя цалкам падтрымліваць IPv6, і да гэтага часу Кітай стане лідарам па колькасці карыстальнікаў IPv6 у свеце. Улады Кітая будуць ствараць «чыстую і светлую» глабальную інтэрнэт-прастору, заявіў старшыня КНР Сі Цзіньпін на адкрыцці ў кастрычніку XIX з'езда Камуністычнай партыі Кітая ў Пекіне.

У сваім прывітальным лісце ўдзельнікам 4-й Сусветнай канферэнцыі старшыня КНР Сі Цзіньпін заклікаў чалавецтва будаваць у кіберпрасторы агульную будучыню. На яго думку, развіццё інтэрнэту суправаджаецца як магчымасцямі, так і выклікамі для суверэнітэту і бяспекі краін. Старшыня КНР таксама выступіў за сумесныя намаганні па абароне суверэнітэту, развіццё партнёрства ў кіберпрасторы на аснове кансультацый. «Мы спадзяёмся на тое, што дзякуючы нашым намаганням зможам зрабіць так, каб усе краіны паспелі сесці на цягнік развіцця інтэрнэту і лічбавай эканомікі», — сказана ў пасланні.

Кіраўнік Раскамнагляда Аляксандр Жараў на канферэнцыі заявіў, што развіццё электронных сэрвісаў спрые росту эканомікі і, па яго ацэнках, у Кітаі і ў Расіі ад 25—30 працэнтаў росту ВУП да 2025 года забяспечаць інтэрнэт-тэхналогіі. Як сказаў Жараў, ідзе «актыўная фаза цыфравізацыі сусветнай эканомікі»: «Гэта прадказальная тэндэнцыя, заснаваная на развіцці сеткі інтэрнэт. Электронныя сэрвісы паскараюць прагрэс і ствараюць умовы для эканамічнага росту ў самых розных галінах эканомікі, мяняюць падыходы да кіравання».

Разам з аптымістычнымі чаканнямі ёсць і непрыемныя моманты. Так, кіраўнік кампаніі «Лабараторыя Касперскага» Яўген Касперскі, выступаючы на канферэнцыі, адзначыў, што ў свеце налічваецца 500 млн «унікальных вірусных файлаў», штодня кампаніяй рэгіструецца звыш 300 тыс. новых вірусаў. У 2017 годзе яго кампанія маркуе выявіць звыш 90 млн новых узораў, і гэта ўсяго за адзін год.

У рамках дыскусіі пра перспектывы і праблемы развіцця штучнага інтэлекту кіраўнік Apple Цім Кук растлумачыў, што яго страшаць людзі, якія думаюць як машыны. «Многае было сказана пра патэнцыйныя негатыўныя аспекты штучнага інтэлекту. Я не баюся машын, якія думаюць як людзі, мяне турбуюць людзі». Па словах Ціма Кука, штучны інтэлект можа пашырыць здольнасці чалавека, падвысіўшы даступнасць медыцыны і адукацыі.

Заснавальнік і старшыня савета дырэктараў кітайскага інтэрнэт-гіганта Alibaba Джэк Ма маркуе, што маштабы пераўтварэнняў, якія нясе з сабой новая тэхнічная рэвалюцыя, могуць перасягнуць усе наватарскія аналагі мінулага, разам узятыя. Лічбавы фактар у найбліжэйшыя 30 гадоў стане асноватворным вытворчым рэсурсам, лічыць Ма, і інтэрнэт ператворыцца ў прадукцыйную сілу. Пры гэтым індустрыяльныя галіны перастануць быць стымулюючым фактарам павелічэння занятасці — іх у гэтым заменіць сфера паслуг.

Супрацоўнікі Кітайскай акадэміі кіберпрасторы прадставілі створаны імі індэкс развіцця інтэрнэту. У яго пакуль што ўвайшлі 38 дзяржаў. Спіс узначальваюць ЗША, Кітай і Паўднёвая Карэя.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

■ Без бар'ераў

# Краіна, камфортная для ўсіх

**Учора міністр інфармацыі Аляксандр КАРЛЮКЕВІЧ і пастаянны прадстаўнік Праграмы развіцця ААН у Беларусі Санака САМАРАСІНХА *(на фота)* падпісалі Інфармацыйную стратэгію Рэспублікі Беларусь па паўнапраўным уключэнні (інклюзіі) людзей з інваліднасцю ў грамадства.**



Фота БЕЛТА.

— Сэнс падпісання дадзенай стратэгіі — абазначэнне прыярытэтаў, — сказаў Аляксандр Карлюкевіч. — Мы хацелі падкрэсліць, што ўсе сродкі масавай інфармацыі будуць уключаны ў гэтую праблематыку. Падпісанне такога дакумента дае нам права выбудаваць цэласную праграму дзеянняў і не проста заклікаць журналістаў «уманціравацца» ў гэты працэс. Яны і зараз шмат пішуць на тэмы інваліднасці. Але мы хочам сістэматызаваць гэтую работу, хочам, каб у яе ўключыліся дзясяткі і сотні выданняў, якія выходзяць у рэгіёнах нашай краіны... І мы будзем актыўна працаваць з міжнароднымі інстытутамі і вылучаць самыя розныя ідэі, якія датычацца забеспячэння работы па дадзенай тэматыцы.

Міністр інфармацыі выказаў таксама надзею, што гэтая праца паўплывае і на тое, што ў нашу краіну будзе прыязджаць больш турыстаў незалежна ад іх фізічных магчымасцей ці не. Рэалізацыя Інфармацыйнай стратэгіі Рэспублікі Беларусь па паўнапраўным уключэнні (інклюзіі) людзей з інваліднасцю ў грамадства дазволіць паказаць Беларусь як камфортную краіну для ўсіх.

Пастаянны каардынатар ААН/ПРААН у Беларусі Санака Самарасінха ў сваю чаргу адзначыў выключныя намаганні, якія робіцца нашай краінай для таго, каб забяспечыць роўны доступ для людзей з інваліднасцю да розных магчымасцяў, а таксама паслуг. Падпісанне Канвенцыі аб правах інвалідаў, па словах прадстаўніка ААН, з'яўляецца яшчэ адным крокам у гэтым накірунку. «Гэта выдатна. Выдатна, што ўжо ёсць Нацыянальны план дзеянняў па рэалізацыі Канвенцыі аб правах інвалідаў, — заявіў пастаянны каардынатар ААН/ПРААН у Беларусі. — Але нічога істотна не зменіцца да таго часу, пакуль мы не змянім сэрцы, мысленне, погляды людзей як з інваліднасцю, так і без інваліднасці, не дапаможам ім адчуць сябе роўнымі. Роля СМІ ў гэтым працэсе вельмі важная. Гэта акно ў свет, праз якое ўсе могуць усвядоміць магчымасць і важнасць паўнапраўнага ўключэння людзей з інваліднасцю ў грамадства».

Варта адзначыць, што Інфармацыйная стратэгія Рэспублікі Беларусь па паўнапраўным уключэнні (інклюзіі) людзей з інваліднасцю ў грамадства — гэта дакумент, закліканы змяніць інфармацыйнае поле ў асвятленні гэтай тэматыкі. Цяпер тэма людзей з інваліднасцю набывае характар адкрытасці на ўсіх дзяржаўных узроўнях і грамадскіх пляцоўках. З'явіўся новы фокус інфармацыйнай працы, накіраваны на павышэнне інфармаванасці аб вострых праблемах людзей з інваліднасцю, пашырэнне іх камунікацыі з навакольным светам. Самі ж людзі з інваліднасцю спадзяюцца, што з падпісаннем дадзенай стратэгіі бар'ераў у іх жыцці стане менш.

Інфармацыйная стратэгія па паўнапраўным уключэнні (інклюзіі) людзей з інваліднасцю ў грамадства распрацавана ў рамках выканання Нацыянальнага плана дзеянняў па рэалізацыі ў Беларусі палажэнняў Канвенцыі аб правах інвалідаў. Яна распрацоўвалася пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі і Праграмы развіцця ААН з удзелам дзяржаўных, міжнародных і грамадскіх арганізацый.

**Святлана БУСЬКО.**
*busko@zviazda.by* ■

■ Блізкая ўлада

# Працуем на апярэджанне

**У Кіраўскім раёне існуе цікавая практыка. Паміж намеснікамі старшыні размеркаваныя ўсе шматкватэрныя дамы, за парадак у якіх яны асабіста нясуць адказнасць. Магчыма, таму на гэтую суботнюю тэлефонную лінію, на якой дзяжурыў намеснік старшыні па будаўніцтве і камунальных пытаннях Кіраўскага райвыканкама Вячаслаў НЯВІНСКІ, не было зваротаў, якія датычыліся б непасрэдна жылля.**

Патэлефанавала жыхарка вёскі Добасна. Яе хвалявала, што павільён комплекснага прыёмнага пункта бытавых паслуг павінен пераехаць у іншае месца. Яна лічыць, што нічога мяняць не трэба, лепш пакінуць усё як ёсць. Ёй паабяцалі, што разбяруцца з пытаннем і знойдуць аптымальнае рашэнне. Жыхарка Кіраўска паведаміла, што дарога, дзе надаўна паклалі водаправод, прасела. Вячаслаў Нявінскі запэўніў яе, што гэта праблема пад кантролем і будзе рабіцца падсыпка грунту. Былі таксама пытанні наконт старшынства ў жыллёва-будаўнічым кааператыве, па асабістай падсобнай гаспадарцы.

Усе пытанні ўзятыя на кантроль, кожнаму дадзены вусныя тлумачэнні, і па меры выканання работ будуць высылацца пісьмовыя справаздачы.

— Пытанняў няшмат, таму што працуем на іх апярэджанне, — адзначае **начальнік аддзела па рабоце са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб Кіраўскага райвыканкама Вольга РУСЕЦКАЯ.** — Сёлета на 1 снежня іх было 79 — на 11 менш, чым летась. Гэта не параўнаць з тымі больш як 800 зваротамі, якія былі ў 2005 годзе, калі я толькі прыйшла сюды працаваць. Раней жыхары не вельмі давяралі мясцовай уладзе, тэлефанавалі адразу ў абласныя структуры. А цяпер спачатку звяртаюцца да нас. Зразумелі, што мы самі зацікаўлены, каб быў парадак.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

*г. Кіраўск* ■

**Калектыў Інстытута журналістыкі БДУ выказвае шчырыя спачуванні старшаму выкладчыку Цыбульскай Маргарыце Пятроўне з прычыны напаткаўшага яе гора — смерці МАЦІ.**

■ З нагоды

# Феміда для найлепшых

## Калі ў пракурора і адваката супадаюць меркаванні

**У звычайным жыцці пракурор з аднаго боку працэсу, адвакат — з другога, суддзя — на сваім месцы. А свята юрыста — адзіны дзень у год, калі яны ўсе збіраюцца разам, спакойна размаўляюць і абменьваюцца меркаваннямі. Такую думку выказаў Валерый МІЦКЕВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта на ўручэнні найвышэйшай юрыдычнай узнагароды краіны — прэміі Феміды — найлепшым юрыстам Беларусі.**

Дзень юрыста, зацверджаны Беларускім саюзам юрыстаў, традыцыйна, ужо 20-ы раз, адзначаецца ў першую нядзелю снежня. Статуэтка багіні правасуддзя ўручаецца за ўклад у стварэнне дэмакратычнага грамадства і развіццё інстытутаў прававой дзяржавы.

— За апошнія гады ў краіне праведзены сур'ёзныя судова-прававыя рэформы, змяніліся функцыі некаторых дзяржаўных органаў. Гэта звязана з развіццём грамадскіх адносін і адаптацыяй функцый юрыдычнай галіны да тых умоў, у якіх працуе краіна, — адзначыў **міністр юстыцыі Алег СЛІЖЭЎСКІ.**

Ён падкрэсліў, што сучасным юрыстам важна не толькі глыбока валодаць нацыянальным заканадаўствам, але і мець высокі інтэлект, уменне гібка мысліць і адаптавацца да зменлівай сітуацыі.

— Прававая культура неадрыўна звязана з прававой адукаванасцю, і год ад году яна расце. Саюз юрыстаў прыкладае да гэтага ўсе намаганні, — лічыць Валерый Міцкевіч. — Беларусы славяцца тым, што яны вельмі законапаслухмяныя. Але, каб прытрымлівацца законаў, іх трэба ведаць. І для гэтага трэба, каб нехта расказаў пра заканадаўства і тое, як яно павінна выконвацца. Пры гэтым яшчэ трэба, каб яно было правільна напісана і прынята. Ва ўсіх гэтых момантах актыўная роля належыць членам саюза юрыстаў.

Сённяшнія спецыялісты юрыдычных спецыяльнасцяў актыўна ўплывалі на падрыхтоўку нарматыўна-прававых актаў аб лібералізацыі бізнесу, якія датычацца развіцця сярэдняга і малога прадпрымальніцтва ў краіне. Яны актыўна ўдзельнічаюць і ў выбарчым працэсе.

Сёлета найлепшыя юрысты краіны атрымалі статуэткі Феміды ў дзесяці намінацыях. А дырэктару Рэгіянальнага цэнтра прававой інфармацыі Брэсцкай вобласці Марыі Базылік намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ўручыў медаль "За працоўныя заслугі".

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Год навукі

# КУРС — НА «УНІВЕРСІТЭТ 3.0»

**Праект стратэгіі «Навука і тэхналогіі: 2018—2040» вынесены на грамадскае абмеркаванне. У дакуменце вызначаны прыярытэты доўгатэрміновага развіцця навукі і тэхналогій, а таксама комплекс інструментаў удасканалення навукова-тэхнічнай сферы, якія забяспечаць новую якасць эканамічнага росту Беларусі і выхад у перспектыве на сусветны ўзровень канкурэнтаздольнасці па шэрагу кірункаў. Мяркуецца, што дзякуючы рэалізацыі стратэгіі да 2040 года навукаёмістасць ВУП павінна скласці 3%, доля прарыўных навуковых даследаванняў і распрацовак — 30% у агульным аб'ёме, доля высокатэхналагічных сектараў у структуры эканомікі — 10%. У агульным аб'ёме вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў інавацыйная прадукцыя будзе займаць 25%. Пра тое, наколькі дасягальныя пастаўленыя мэты, мы пацікавіліся ў эксперта.**

**Васіль САФОНАЎ, прарэктар па навуковай рабоце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

— Адзін з раздзелаў стратэгіі прысвечаны развіццю кадравага патэнцыялу і практычнай рэалізацыі канцэпцыі «Універсітэта 3.0». Што маецца на ўвазе? У першую чаргу, стварэнне інтэграванага адукацыйнага, навукова-даследчага і прадпрымальніцкага асяроддзя, адзінства сістэмы «адукацыя — навука — інавацыя — камерцыялізацыя». Усе ўніверсітэты, якія ўваходзяць у сусветных рэйтынгах у ТОП-10 і нават у першую сотню, уяўляюць сабой магутныя навукова-адукацыйныя карпарацыі, цэнтры навуковых ведаў і генератары інавацыйнага развіцця. Сучасны ўніверсітэт ужо апрыёры не можа займацца толькі падрыхтоўкай кадраў. Гэта агульнасусветны трэнд, які нельга ігнараваць. Дзеля справядлівасці хачу заўважыць, што Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт даўно рухаецца тым жа шляхам. На сённяшні дзень у склад БДУ ўваходзяць чатыры навукова-даследчыя інстытуты, два нацыянальныя навуковыя цэнтры і пяць інавацыйных унітарных прадпрыемстваў. У комплексе БДУ працуюць каля 700 навуковых даследчыкаў і высокакваліфікаваных спецыялістаў. Як завяршальнае звяно ў інавацыйным ланцужку ў гэтым годзе ў БДУ арганізаваны навукова-тэхналагічны парк на базе УП «Унітэхпрам БДУ». Навукова-вытворчая дзейнасць універсітэта нацэлена на рэалізацыю вынікаў даследаванняў у самых актуальных напрамках: бія- і нанатэхналогіі, зялёная хімія і фармацэўтыка, інфарматыка і камп'ютарныя тэхналогіі, касмічныя тэхналогіі і г. д.

Пры складанні сусветных рэйтынгаў ВНУ адны з самых важных крытэрыяў, што бяруцца пад увагу, гэта акадэмічная рэпутацыя, індэкс цытавання навуковых работ, навуковая прадукцыйнасць і ацэнкі наймальнікаў. Паколькі БДУ ў апошнія гады прысутнічае ва ўсіх самых аўтарытэтных рэйтынгах, увахадзіць стабільна ў два працэнты найлепшых універсітэтаў свету, мяркую, што рухаемся мы правільным шляхам. Самае галоўнае — імкнёмся ствараць для моладзі і маладых вучоных умовы і магчымасці. У рамках рэалізацыі канцэпцыі «Універсітэта 3.0» студэнты і маладыя навукоўцы БДУ атрымаюць навыкі прадпрымальніцтва ў навукова-інавацыйнай сферы, у тым ліку ва ўніверсітэцкім стартап-цэнтры. У БДУ сёння працуе 43 студэнцкія навукова-даследчыя лабараторыі, больш за 100 навуковых гурткоў. З мэтай стымулявання іх актыўнасці па працягу многіх гадоў праводзіцца конкурс на самую лепшую лабараторыю. Быў праведзены таксама конкурс на найлепшы навуковы гурток. Важным інструментам маладзёжнай палітыкі з'яўляецца конкурс на самую лепшую навуковую работу сярод студэнтаў БДУ і ўдзел нашых хлопцаў і дзяўчат у аналагічным рэспубліканскім конкурсе. Мы матэрыяльна заахвочваем абарону кандыдацкіх дысертацый. Але пакуль яшчэ застаецца шэраг, так бы мовіць, тэхнічных праблем, якія трэба вырашаць на ўзроўні заканадаўства.

Што хацелася б змяніць? Мы ўносілі прапанову па вызваленні ад падатку на дабаўленую вартасць пры набыцці абсталявання для ажыццяўлення навуковай інавацыйнай дзейнасці. Ёсць пытанні па рабоце цэнтраў калектыўнага карыстання навуковым абсталяваннем, хацелася б, каб яны працавалі больш эфектыўна. Раней студэнты пасля трэцяга курса маглі залічвацца стажорамі малодшых навуковых супрацоўнікаў. Але цяпер амаль усе спецыяльнасці перайшлі на чатырохгадовы тэрмін навучання. Мы лічым, што маладым людзям трэба дазволіць быць стажорамі ўжо пасля першага ці нават на першым курсе, каб яны маглі вучыцца і паралельна зарабляць на навуцы грошы. Студэнты, якія займаюцца навукай, хацелі б удзельнічаць у міжнародных канферэнцыях і навуковых мерапрыемствах, але з фінансаваннем такіх паездак таксама ўзнікаюць праблемы.

Упэўнены, што мэты, пастаўленыя ў стратэгіі развіцця навукі да 2040 года, — дасягальныя, а вось распрацоўка механізмаў іх рэалізацыі будзе залежаць ад кожнага з нас ну і, вядома, ад таго, наколькі аператыўна будуць прымацца важныя заканадаўчыя акты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ЗША і Паўднёвая Карэя пачалі найбуйнейшыя сумесныя вучэнні

Ваенна-паветраныя сілы ЗША і Паўднёвай Карэі пачалі ваенныя вучэнні пад кодавай назвай «Vigilant Ace» («Пільны Ас»). Паўднёвакарэйскія СМІ паведамляюць, што гэтыя манёўры стануць самымі буйнамаштабнымі ў гісторыі — у іх будуць задзейнічаны каля 230 самалётаў, уключаючы шэсць амерыканскіх знішчальнікаў-невідзімак F-22. У Мінабароны Паўднёвай Карэі заявілі, што вучэнні закліканы паказаць волю і здольнасць Сеула і Вашынгтона рэагаваць на «правакацыі Паўночнай Карэі» з пускамі балістычных ракет.

## Контрразведка ФРГ лічыць крыніцай пагрозы дзяцей і жонак баевікоў ІД

Дзеці і жонкі ўдзельнікаў тэрарыстычнай арганізацыі «Ісламская дзяржава» (ІД) апошнім часам усё часцей вяртаюцца з Сірыі і Ірака на тэрыторыю Германіі. Аб патэнцыйнай пагрозе з іх боку заявіў кіраўнік ведамства па ахове канстытуцыі (контрразведка) ФРГ Ханс-Георг Масен у інтэрв'ю агенцтву DPA. «Удзельнікі баявых дзеянняў усё часцей задумваюцца аб тым, каб адправіць членаў сваіх сем'яў у бяспечнае месца, на Захад. Калі гаворка ідзе пра немцаў, то яны маюць права ўехаць на тэрыторыю федэратыўнай рэспублікі», — сказаў кіраўнік ведамства. «Некаторым дзецям «прамылі мазгі» ў так званых школах на тэрыторыі ІД і моцна спрыялі іх радыкалізацыі. Для нас гэта з'яўляецца праблемай, паколькі гэтыя дзеці і падлеткі часам могуць быць небяспечнымі», — адзначыў Масен. Паводле яго слоў, патэнцыйная пагроза зыходзіць і ад жанчын, якія жылі ў апошнія гады на тэрыторыях, падкантрольных ісламістам. «Яны вельмі часта маюць радыкальныя погляды і падзяляюць ідэалогію ІД, — сказаў Масен. — Гэта не азначае, што яны гатовыя ажыццявіць тэракт, аднак мы не павінны спускаць з іх вачэй».

## Браты Уінклвасы сталі першымі ў свеце біткойнавымі мільярдэрамі



Браты-блізняты Тайлер і Кэмеран Уінклвасы сталі першымі ў свеце мільярдэрамі, якія здолелі зарабіць свой капітал на біткойнах. Ім належыць каля 1% гэтай крыптавалюты, піша брытанскае выданне Telegraph. Прычым прадаваць яе яны не збіраюцца, лічачы гэта доўгатэрміновым укладаннем, і прагназуюць рост кошту біткойна да $40 тыс. З'яўленне першых мільярдэраў, якія зарабілі свой капітал на крыптавалюце, — «знакавы момант для спрэчнага актыву», заўважае Telegraph. Свае біткойны Уінклвасы набылі на сродкі, атрыманыя ад стваральніка Facebook Марка Цукерберга, — у 2008 годзе ён заплаціў ім $65 млн.

# СВЯТА ДЛЯ ЎСІХ

## Дабрачынная навагодняя акцыя «Нашы дзеці» стартуе 11 снежня

**Да яе правядзення падключацца 90 міністэрстваў, ведамстваў, грамадскіх аб'яднанняў. Ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны з 11 снежня 2017 года па 10 студзеня 2018-га адбудуцца навагоднія ранішнікі. У іх прымуць удзел больш як 15 тысяч дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў, дзяцей, чые бацькі загінулі пры выкананні службовых абавязкаў.**

«Радуе, што да дабрачыннай навагодняй акцыі падключаецца ўсё грамадства, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі Алена ГАЛАЎНЁВА.** — Мы назіраем пазітыўную тэндэнцыю, калі некаторыя фізічныя асобы, індывідуальныя прадпрымальнікі аказваюць дапамогу ў правядзенні навагодніх свят, арганізоўваюць свае акцыі, робяць ахвяраванні».

Святочныя мерапрыемствы адбудуцца ва ўсіх малых і вялікіх населеных пунктах. Галоўная ж ёлка краіны пройдзе ў Палацы Рэспублікі ў Мінску, сюды запрошаны 2370 дзяцей з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Рыжскай беларускай школы, беларускай гімназіі імя Францыска Скарыны ў Вільнюсе.

**Надзея ДРЫЛА.** *dryla@zviazda.by*

■ Надвор'е

# То дождж, то снег

## У пачатку снежня — лістападаўскае надвор'е

**На гэтым тыдні будзе няўстойлівае надвор'е з ападкамі і павышаным тэмпературным фонам, паведамілі спецыялісты ў Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У сераду на большай частцы тэрыторыі краіны мокры снег, дождж і слабы галалёд. Уначы і раніцай на дарогах чакаецца галалёдзіца. Уначы — ад мінус 4 да плюс 1 градуса, па ўсходзе — да 6 марозу. Удзень будзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах тэмпература павысіцца да 6 цяпла. У чацвер пройдуць ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 1 — мінус 6 градусаў, удзень складзе ад мінус 2 да плюс 4 градусаў. Па паўднёвым захадзе краіны будзе цяплей. Уначы — 1—5 цяпла, удзень — плюс 5—7 градусаў.

У пятніцу атмасферныя франты пакінуць тэрыторыю Беларусі, і ападкаў будзе няшмат, толькі ўначы па паўночным усходзе, а ўдзень у асобных раёнах краіны не абыдзецца без кароткачасовага мокрага снегу з дажджом. Месцамі чакаецца туман, уначы і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў. Удзень — ад нуля да плюс 5 градусаў, па поўдні ў другой палове дня — да 7 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Мы і свет

# На ніве супрацоўніцтва

**У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь абноўлены склад каардынацыйнай групы па рэалізацыі Праекта перакладу і публікацыі класічных літаратурных твораў Кітая і Беларусі.**

Створана гэтая група была яшчэ 31 сакавіка 2015 года. Мэта — спрыяць ажыццяўленню перакладчыцкіх праектаў, якія б знаёмілі чытачоў у Беларусі з кітайскай літаратурай, а ў Кітаі — з беларускай.

Зараз у склад групы ўваходзяць першы намеснік міністра інфармацыі краіны Ігар Луцкі, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, дацэнт Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Анастасія Букатая, кансультант упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Мінінфарма Людміла Быкава, дацэнт Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ Юлія Малаткова, намеснік начальніка фінансава-эканамічнага аддзела Мініфарма Кацярына Самойлава, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел Сухарукаў, кансультант інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Мініфарма Андрэй Чэрнікаў.

**Сяргей ШЫЧКО**

■ Здарэнне

# ХТО КІРОЎЦА?

**Следчыя ўстанаўліваюць абставіны і прычыны ДТЗ у Жыткавіцкім раёне, у выніку якога загінулі тры чалавекі.**

Аварыя адбылася 3 снежня каля 14.00. На 7-м кіламетры аўтадарогі Чэрнічы — Горка кіроўца аўтамабіля Mercedes-Benz S350 не справіўся з кіраваннем, з'ехаў у левы кювет, дзе сутыкнуўся з дрэвам. Пасля чаго аўтамабіль перакуліўся. У выніку ДТЗ грамадзяне, якія знаходзіліся ў аўтамабілі — жыхары вёскі Альшаны Столінскага раёна 1988 і 1999 гадоў нараджэння, — ад цялесных пашкоджанняў памерлі на месцы. Іх аднавяскоўец 1999 года нараджэння (уладальнік аўтамабіля) быў шпіталізаваны ў Жыткавіцкую цэнтральную раённую бальніцу, дзе ў той жа дзень памёр. Па факце ДТЗ распачата крымінальная справа. Прызначаны судова-медыцынская, аўтатэхнічная, судова-біялагічная і іншыя экспертызы.

Следства таксама ўстанаўлівае тое, хто з трох хлопцаў кіраваў аўтамабілем. Вядома, што ў дваіх былі пасведчанні кіроўцы, а ва ўладальніка аўтамабіля — не.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ПАДВОДНЫ МАСАЖ І АСАБІСТЫ ТЭРАПЕЎТ

## ПУСКАЛІ Ў РЭАНІМАЦЫЮ. НЕ КЛАЛІ Ў БАЛЬНІЦУ

Усё залежыць ад канкрэтнага спецыяліста, да якога трапіш, упэўнена Наталля, бацькоў якой ужо няма ў жывых. Яна таксама прывозіла іх у свой час у горад на зіму і мае розны вопыт абыходжання.

— Майму бацьку ампутавалі абмарожаныя пальцы на нагах і руках. Ён тры месяцы ляжаў у бальніцы. Там вельмі ўважліва да яго ставіліся, дапамагалі ва ўсім. Нават на нейкі час дадому адпусцілі. Сказалі, што так яму псіхалагічна будзе лягчэй, калі ад бальнічных сцен перадыхне, пабудзе з роднымі. Пасля зноў паклалі. Зрабілі спецыяльны разрэз на кісці, каб ён мог лыжку з відэльцам трымаць, — успамінае Наталля. — А як мама ляжала, дык мяне нават у рэанімацыю пускалі. У яе энтэракаліт быў, дык медыкі з хуткай дапамогі прыехалі і казалі ўсё: «Асцярожненька, не спяшайцеся». Пад рукі яе вялі, дапамагалі.

Акрамя станоўчых момантаў, памятае мінчанка, як прыходзілася змагацца за права атрымаць меддапамогу:

— Аднойчы ў бацькі моцна разбалеўся жывот. Выклікалі «хуткую», брат павёз яго ў бальніцу. А там укол зрабілі і кажуць: вязіце, маўляў, дахаты. Я давай дзяжурнаму ўрачу абурацца: што адбываецца, чаму не абследавалі, не ўзялі аналізы. «Ён вернецца дахаты, зноў забаліць, і мне што, зноў выклікаць хуткую дапамогу?» — пыталася. — «Ваша права», — кажа ён. Толькі калі я папрасіла яго прадставіцца, каб магла спасылацца, хто адмаўляе ў шпіталізацыі пры вострым болі, бацьку павялі на аналізы. Свякроў вось пакутуе ад высокага ціску. Забяруць яе ў бальніцу, саб'юць яго і дахаты адпраўляюць. А высветліць прычыну, чаму месяц той ціск скача раптоўна ажно да 200, а з раніцы бывае паніжаецца да 60-ці, ніхто не бярэцца.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ПРЫМАЦАВАЎСЯ — АТРЫМАЎ

— Прыезджыя старыя становяцца паўнапраўнымі жыхарамі любога мікрараёна горада і карыстаюцца ўсімі медыцынскімі паслугамі, — упэўнена **Наталля МЫСЛІЎЧЫК, галоўны ўрач 36-й гарадской паліклінікі.** — Яны заказваюць талончыкі да ўрачоў, могуць выклікаць тэрапеўта дадому, лячыцца ў аддзяленні дзённага знаходжання. Калі патрэбна спецыялізаваная дапамога, даём накіраванні ў бальніцу.

Прымацавацца да паліклінікі па месцы жыхарства сваякоў старым людзям проста. Дастаткова напісаць заяву, дзе ўказаць, з якой па якую даты чалавек хоча тут абслугоўвацца. Як правіла, гэта робяць адразу на год. Адмовіць у прымацаванні ці зняць з уліку старога вяскоўца могуць, калі ўрачы не знаходзяць яго па ўказаным адрасе.

Заява разглядаецца за адзін дзень. За наступныя тры ва ўстанову, дзе чалавек абслугоўваўся папярэдне, дасылаюць паведамленне, што ён часова прымацаваны да іншай паліклінікі. У адказ прыходзіць выпіска з медыцынскіх дакументаў.

— Мы павінны мець уяўленне пра стан здароўя пажылога пацыента. Здараецца, прыязджаюць і інваліды, і людзі з рознымі захворваннямі, якім неабходна выпісваць льготныя медыкаменты. Часта мы нават карэкціруем прыём прызначаных ім раней прэпаратаў, — расказвае галоўны ўрач. — Што ні кажы, у горадзе больш магчымасцяў трапіць да профільных спецыялістаў, якія дапамогуць удакладніць дыягназ. Гэта зручна і пры афармленні групы інваліднасці. Бадай што ўсе патрэбныя ўрачы ў адной паліклініцы, не трэба бегаць па розных установах. У паліклініцы праводзім патрэбнае абследаванне і накіроўваем пацыента на агляд у МРЭК (медыка-рэабілітацыйную экспертную камісію).

На кожнага новага пацыента заводзяць медыцынскую картку. Калі ён збіраецца вярнуцца дахаты на вёску, чалавеку робяць выпіску, дзе ўказваюць усе пройдзеныя ім даследаванні, флюараграфію, аналізы і іншае. Калі за тыдзень да канца тэрміну прымацавання пацыент не піша заяву паўторна, яго аўтаматычна здымаюць з уліку.

## БЯСПЛАТНА І ЗА ГРОШЫ

Усе паслугі для старых бясплатныя. Аднак, як і любы пацыент, яны могуць паскорана атрымаць медыцынскую дапамогу за грошы. Тое, што не ўваходзіць у «клінічны пратакол лячэння па захворванні», таксама аплачваецца, напрыклад, падводны душ-масаж.

— У нас жанчына неяк афарміла абаім сваім бацькам паслугу «асабісты ўрач-тэрапеўт». У ёй дакладна прадугледжана, колькі разоў за год старыя павінны агледзець розныя спецыялісты (тэрапеўт, афтальмолаг, кардыёлаг...), якія трэба зрабіць даследаванні, — тлумачыць Наталля Мысліўчык. — Загадчыку тэрапеўтычнага аддзялення асабіста тэлефануюць на мабільны і дагаворваюцца аб даце і часе правядзення пэўных працэдур. І ніякіх вам чэргаў і кантактаў з іншымі пацыентамі.

Набор працэдур, якія можна ўключыць у паслугу асабістага тэрапеўта, папярэдне выбіраецца з пераліку тых, што аказваюцца ў паліклініцы. Акрамя звычайных, можна заказаць сутачнае маніторыраванне электракардыяграмы, артэрыяльнага ціску, ультрагукавое даследаванне сасудаў, праверку шчытападобнай залозы і іншае.

Пасля выкліку хуткай дапамогі тэрапеўт абавязкова наведваецца да хворага на наступны дзень. Ён удакладніць, што здарылася, разбярэцца, чаму не спрацавала прызначанае лячэнне. Магчыма, скарэкціруе яго, падкажа, як самастойна купіраваць высокі ціск, калі выклік «хуткай» быў праз гэта, дадала галоўны ўрач.

Калі старым раптоўна спатрэбіўся догляд праз цяжкае захворванне, іх дарослым дзецям могуць выпісаць нават бюлетэнь па доглядзе непрацаздольнага члена сям'і. Гэта датычыцца, напрыклад, выпадкаў інсульту. Праўда, тэрмін такога бальнічнага абмежаваны максімум адным тыднем, а дакумент выдаецца толькі праз урачэбна-кваліфікацыйную камісію.

Усе мы ў свой час станем старымі. І хочацца верыць, што ў тую пару мы не застанемся без спагады дзяцей і ўрачоў і праслявуты «чалавечы фактар» нас не закране.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# Трамвайная «рулетка»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Упершыню трамвай там прагрукацеў яшчэ ў 1957 годзе. У Мінску тады гэты від грамадскага транспарту быў на піку росквіту, а вось легкавых аўтамабіляў было вельмі мала. Таму тагачасныя архітэктары доўга не думалі і праклалі нітку трамвайных пуцей акурат пасярэдзіне дарогі. Пры гэтым для пяціпавярховікаў і карпусоў завода выпічальнай тэхнікі пакінулі вузкаватыя тратуары.

Апошнія дзесяцігоддзі колькасць аўтамабіляў у краіне няспынна павялічвалася. Разам з імі больш стала і ДТЗ на трамвайных рэйках. І сотні пасажыраў, аплаціўшы праезд, вымушаны дабірацца да найбліжэйшых пунктаў перасадкі або працы ці вучобы пешкі. Час прастою можа складаць як 15 хвілін, так і амаль гадзіну. І калі б гэта было эпізадычна — паклаўшы руку на сэрца, у руху любога транспарту таксама бываюць збоі, у тым ліку і працяглыя. Але і летась, і сёлета трамваі стаялі на вуліцы Коласа больш за сто разоў — згодна з хронікай збояў работы грамадскага транспарту на сайце «Мінсктранса».

Праблема, як бачым, даволі вострая. Яшчэ больш яна абвастрылася з-за зносу ў 2013-м прамежкавага кальца, якое размяшчалася прыкладна пасярэдзіне веткі. Аўтар гэтых радкоў неадназова бачыў, як «кавалькада» з 2—3 дзясяткаў вагонаў каталася дадатковыя два кіламетры да кальца ў Зялёным Лузе і столькі ж назад. Хоць раней частка трамваяў разварочвалася на тым самым кальцы. А па часе гэта прыбаўляе, згодна з раскладам, каля 15—17 хвілін. Ды і пасля гэтай «кавалькада», зразумела, за пару хвілін не рассмокчацца.

...На стале ў **начальніка аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак дзяржаўнай установы «Сталічны транспарт і сувязь» (СТіС) Аляксандра КАПЦЮХА** ляжыць папка, якая па таўшчыні нагадвае дыпломную работу. Гэта — аналіз таго, як працуе трамвайная сістэма ў Мінску, і адначасова — рэкамендацыі па тым, як палепшыць яе характарыстыкі. Значная частка дакумента, які быў падрыхтаваны па замове СТіС Беларускім саюзам транспартнікаў, прысвечана праблеме трамвая на вуліцах Коласа і Чырвонай.

— Любыя прапановы па паляпшэнні работы трамваяў аб'ектыўныя і пацягнуць за сабой у выпадку ўхвалення сур'ёзныя змены ў арганізацыі руху, а таксама шмат у чым і будаўнічыя работы, — кажа Аляксандр Капцюх. — Яны датычацца інфраструктуры трамвайнай сістэмы. Мы разумеем, што сёння праблемы ў руху трамваяў звязаны з ДТЗ, якія здзяйсняюць на пуцях аўтамабілі. Таксама па ПДР рух па трамвайным палатне дазволены, калі кіроўцы паварочваюць налева. І не будзем забываць, што пасля рэканструкцыі 2013 года паміж рэйкамі былі пакладзены бетонныя пліты, якія спакушаюць кіроўцаў выкарыстоўваць для руху і гэтую паласу.

***— Ці можна зрабіць на вуліцы Коласа адасобленую паласу для трамвая?***

— Мы прапаноўвалі разгледзець адасабленне трамвайных рэек не жорсткім бар'ерам, а іншымі сродкамі, якія дазволілі б праязджаць па рэйках аўтамабілям экстранных службаў. Скажам, павышэнне бартавога каменя, усталёўка паўсфер... На асобных перагонах прапаноўвалася паставіць паміж пуцей плот, які б раздзяляў сустрэчныя плыні. Але для гэтага спатрэбіцца ўнесці карэктывы ў нарматыўныя дакументы па будаўніцтве. Ды і месцамі такі плот паставіць тэхнічна немагчыма.

***— А ці магчыма стварыць сумешчаную аўтобусна-трамвайную паласу, як тое ёсць у Рызе? Калі нават трамваі і стануць, то аўтобус людзей вывезе.***

— У любым выпадку, усе гэтыя рэкамендацыі павінны быць спярша ўзгоднены з ДАІ. Такая задума сапраўды гучала. У якасці эксперымента хацелі прапанаваць невялічкую дыстанцыю па праспекце Машэрава, дзе трамвайныя прыпынкі створаны ў выглядзе астраўкоў і ўжо існуе аўтобусны маршрут. Але пасля высветлілася, што шырыня трамвайных пуцей не дазваляе разысціся двум сустрэчным аўтобусам. Так і давялося адмовіцца ад гэтай ідэі.

***— Можа, варта вярнуць развароткае кальцо «Валгаградская», якое было дэмантавана чатыры гады таму...***

— Так, такая прапанова таксама прагучала. І нават больш за тое, складальнікі плана прапанавалі стварыць яшчэ адно развароткае кальцо — непасрэдна каля станцыі метро «Плошча Якуба Коласа» на месцы існуючай паркоўкі. Ідэя цудоўная, бо тады можна стварыць чыста лакальны маршрут па ўсёй даўжыні вуліцы Коласа, які даставіць да метро. І таксама «выключыцца» некалькі даволі праблемных участкаў.

***— Што да прыпынкаў — яшчэ ёсць месцы, дзе трамвай высаджвае людзей прама пасярод дарогі. А кіроўца аўтатранспарту можа і не затармазіць. Я так сам ледзь не трапіў пад колы пару разоў...***

— Такіх прыпынкаў пяць. У інвестыцыйную праграму Мінска на 2018 год мы ўнеслі прапанову распрацоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі па іх абсталяванні рэфюжамі — пасадачнымі астраўкамі. Спадзяёмся, што яе прымуць. Бо задаліся выпадкі, калі кіроўцы збівалі пасажыраў трамвая. Абысціся без рэфюжаў можна было 2—3 дзесяцігоддзі назад, калі аўтаплынь была меншая ў дзясяткі разоў. Ды і па прапускной здольнасці вуліцы іх адсутнасць таксама адбіваецца далёка не лепшым чынам: дзве паласы стаяць і чакаюць, пакуль скончыцца пасадка-высадка...

## НАЗАД У МІНУЛАЕ

Прыкладна ў канцы 1970-х гадоў у Мінску пачалі з'яўляцца трамваі, счэпленыя па два. Такі міні-цягнічок называўся сістэмай многіх адзінак. І гэта быў апраўданы крок, бо такім чынам правазная здольнасць трамвая рэзка вырасла. Нездарма ж цягнікі ў метро і на чыгунцы счэплены па вялікай колькасці вагонаў. Але старыя рыжскія, а пасля і чэшскія трамваі, якія маглі працаваць у такім рэжыме, састарэлі і былі паступова спісаны. Апошняя такая пара выйшла з варот трамвайнага парка на лінію каля дзесяці гадоў таму. Чаму так адбылося? Абсалютную большасць рухомага саставу зараз складаюць мадэлі АКСМ-60102 айчыннай вытворчасці, якія сістэму многіх адзінак не падтрымліваюць. І на гэта ў справаздачы Беларускага саюза транспартнікаў таксама звернута ўвага.

***— Калі ж мяркуецца ўвасобіць гэтыя прапановы ў жыццё?***

— Мы ўжо разаслалі ў «Мінсктранс» і ДАІ адпаведны план мерапрыемстваў на 2018 і 2019 гады. Акрамя працэдуры ўзгаднення, трэба яшчэ знайсці і сродкі — даводзенне трамвайнай інфраструктуры, як кажуць, «да розуму», запатрабуе істотных грашовых уліванняў. Разам з тым гэты план мы меркавалі вынесці на пасяджэнне камісіі па паляпшэнні якасці трамвайнага руху пры Мінгарвыканкаме. Спадзяёмся, што яно адбудзецца ў снежні.

***— Але ці не пагоршыць умовы для легкавога транспарту адасабленне трамвайнай лініі?***

— Калі з-за ДТЗ аказаўся паралізаваны рух грамадскага транспарту, то экіпаж на месца падзей высылаецца неадкладна, — кажа **старшы інжынер па арганізацыі дарожнага руху аддзела ДАІ Савецкага РУУС Дзяніс ЛІВАНОВІЧ.** — Іншая справа, што кіроўцы могуць некаторы час высвятляць паміж сабой адносіны, і толькі пазней патэлефанаваць па нумары 102. А за імі ўжо збіраецца чарада трамваяў...

Самы балючы пункт — гэта перакрыжаванне вуліц Коласа і Хмяльніцкага. Напрыклад, толькі ў 2014 годзе там адбылося шэсць ДТЗ з удзелам трамваяў. А яшчэ дадайце сюды сітуацыі, калі на рэйках сутыкаецца адзін з адным пабочны транспарт.

— Ці вось узяць, напрыклад, перагон Бялінскага—Калініна, — працягвае Дзяніс Лівановіч. — Ён дасягае ў даўжыню амаль 600 метраў. З аднаго боку — глухі плот вайсковай часці, а вось з другога — шматлікія заезды ў двары. Выносіліся прапановы забараніць там рух аўтатранспарту цераз пуці, каб машыны, якія выязджаюць з двароў, маглі паварочваць толькі направа. Розныя былі прапановы — і плот паставіць паміж сустрэчнымі напрамкамі, і нават адасобіць пуці. Але калі камусьці з кіроўцаў трэба будзе налева, то ён выканае паварот на найбліжэйшым скрыжаванні. Тым самым павялічыцца нагрузка на яго. Разам з тым кіроўца і па ПДР павінен саступіць дарогу трамваю. А сустрэчная плынь можа не прапусціць. І вось так пачынаюцца манеўры: заехаў на рэйкі — з'ехаў з іх — вярнуўся назад. У рэшце рэшт гэта можа скончыцца ДТЗ. Я сам аднойчы бачыў нешта падобнае на гэтай вуліцы, толькі на іншым скрыжаванні.

Што ж, алгарытм выхаду з непрыемнай сітуацыі, якая склалася з маральна састарэлай трамвайнай інфраструктурай, ужо складзены. Засталося дачакацца яго як мага хутчэйшага ўвасаблення. Гуляць у рулетку «даедзе або не даедзе», шчыра кажучы, вельмі надакучыла...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# ПАЙШОЎ ПРЫЗЫЎНІКОМ, ПРЫЙДЗЕ АБАРОНЦАМ

## Як карэспандэнт «Звязды» рыхтаваўся да службы ў войску



Стрыжка і галенне барады: «рытуал» дапамаглі правесці сябры.

**Чарговая порцыя прызыўнікоў гэтай восенню ўжо змяніла паўсядзённае адзенне на вайсковую форму. Вучыцца абараняць Радзіму пайшоў і наш фотакарэспандэнт. Пра армейскую службу Сяргей Нікановіч ведае не па чутках — за некалькі гадоў працы ў рэдакцыі са сваім фотаапаратам ён аб'ездзіў многія воінскія часці. У яго аб'ектыве адлюстроўваліся ключавыя падзеі, якія ў апошні час адбываліся ва Узброеных Сілах: вучэнні, пастаўка ў беларускую армію новых узораў тэхнікі і ўзбраення, ваенныя парады... На фотаздымках Сяргея — прадстаўнікі самых розных вайсковых прафесій. Не раз сваімі фотарэпартажамі ён праводзіў чарговых навабранцаў у армію. Здаецца, ужо неаднойчы «прымаў» з імі прысягу...**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Маладыя байцы чакаюць апошнюю перад адпраўкай медкамісію.



Сярод абавязковага агляду — стаматолаг...

Цяпер Сяргей — па іншы бок аб'ектыва. І нам, яго «звяздоўскім» калегам, стала цікава, як ён адчувае сябе ў новай ролі.

### ПРА САМАСТОЙНАСЦЬ І ЎЗБЕКСКІ ПЛОЎ

Панядзелак. Змяркаецца. Толькі пасля працы дамоў не спяшаемся. На сённяшні вечар — іншыя планы. Сяргей чакае нас у мінскай кватэры, дзе жыве з бацькамі і малодшай сястрой. Ён ужо здаў свае апошнія фотаздымкі рэдактару аддзела, таму з чыстым сумленнем рыхтуецца да войска.

Нас сустракаюць бацькі Сяргея. Дома і сястра Насця. Ала Яўгенаўна адразу запрашае за стол, мы сціпла адмаўляемся. Праўда, ненадоўга — перад гасціннасцю гаспадыні цяжка ўстаяць, а мы, між іншым, яшчэ не вячэралі.

Відаць, што мама хвалюецца. Не з-за гасцей, вядома: і не такіх сустракалі! Праз некалькі дзён на аднаго члена сям'і часова стане менш.

— Якім бы самастойным ні быў Сяргей, усё роўна ж перажываеш, — прызнаецца Ала Яўгенаўна. — Гэта сын, і маме яго асабліва будзе не хапаць. Вечарам прыходзім з работы, збіраемся за вячэрай і расказваем, як для каго склаўся дзень. Ды што тут хаваць: і матэрыяльна ён нам дапамагае.

«Нічога, няхай паслужыць, хоць пасталее, — да размовы далучаецца бацька. — Ужо навучыцца і гузік прышыць, і адзенне памыць. Мужчынскі калектыў загартоўвае, армія надае самастойнасці».

Уладзімір Аляксандравіч ведае гэта не па чутках. Яго служба праходзіла на таджыкска-афганскай мяжы, акурат пасля вываду савецкіх войскаў з Афганістана. Па словах пагранічніка, вайна хоць і скончылася, але цішэй там не стала: увесь час былі як на парахавой бочцы.

— Затое бацька навучыўся ў войску гатаваць узбекскі плоў, які вельмі любіць уся наша сям'я, — прызнаецца Сяргей. — Як ні спрабуй паўтарыць рэцэпт, ніколі так, як у яго, не атрымаецца.

«Мы толькі пазнаёміліся, як Валодзя ў армію пайшоў, — успамінае Ала Нікановіч. — Пісьмы часам ішлі па два-тры тыдні. Чакаеш, а цэлы месяц вестачкі няма — пачынаеш перажываць. Потым у паштовай скрыні адразу чатыры канверты знаходзіш». Як прызнаецца мама Сяргея, з хлопцамі, якія не служылі ў войску, у той час дзяўчаты нават сябраваць не хацелі, што ўжо казаць пра тое, каб замуж выйсці.

### КАЛІ НЕ ДА КНІГ

А тым часам Сяргей збірае неабходныя ў войску рэчы. У заплечнік, у якім яшчэ нядаўна ляжаў фотаапарат, ён складвае ніткі, мыльніцу, мыла, зубную шчотку ў футляры, зубную пасту, станкі для галення, кнопачны мабільны тэлефон, якім дазволяць карыстацца ў вызначаны для гэтага час, расчоску, крэм для абутку...

— Малую баначку бярэш, — кажа бацька. — Мы ў свой час крэмам запасаліся: салдацкія боты павінны былі блішчаць і днём і ноччу. А вось расчоску *(смяецца)* можна і не браць: усё роўна паголяць.

Для Сяргея, дарэчы, гэта асобная тэма. Ён жа некалькі гадоў адрошчваў бараду. «Нічога, затое будзе новы імідж», — на поўным сур'ёзе кажа наш прызыўнік. А вось чаго ў войску яму будзе па-сапраўднаму не хапаць, дык гэта кніг. Іх браць з сабой непажадана — бібліятэкі воінскіх частак прапаноўваюць чытво на любы густ.

— Ды і ці будзе ў яго на гэта час, — сумняваецца маці. — Калі я першы раз збіралася ў радзільны дом (дарэчы, Сяргея чакала), думала, што буду рабіць да таго моманту, калі дзіця народзіцца, і ўзяла з сабой кнігу Драйзера. Акушэрка, убачыўшы мае рэчы, моцна здзівілася. У палаце смяяліся нават тыя, каму было не да гэтага. Праз 15 хвілін я зразумела, што ў такія моманты сапраўды не да кніг. Супадзенне альбо не, але іх Сяргей цяпер з рук не выпускае.

«А вось канверты, сынок, лепш узяць, — раіць бацька. — Гэта добра, што мабільнымі тэлефонамі дазволілі карыстацца, але хоць адно пісьмо каб нам напісаў! Такая традыцыя».



Прызыўнік збірае сумку.

### МЕСЯЦЫ БЕЗ ФОТААПАРАТА

Служыць Сяргей Нікановіч будзе ў рэзерве, у 2-й інжынерный брыгадзе. Гэта недалёка ад Мінска, у пасёлку Сосны. Асвоіць інжынерную справу захацеў сам. Ваенная сувязь і пяхота, куды па сваіх якасцях і здароўі таксама падыходзіў, зацікавілі менш.

— Нягледзячы на тое, што я гуманітарый, увесь час думаў, што нядрэнна было б атрымаць і тэхнічную адукацыю, — гаворыць Сяргей. — Магчыма, у жыцці яна мне мала спатрэбіцца, але мужчыну гэта карысна хоць бы для агульнага развіцця.

Вядома, яму пакуль цяжка ўявіць свае дні без фотаапарата. Ды і як не націснуць адпаведную кнопачку, калі раптам, як кажуць прафесіяналы, бачыш кадр. «Калі ты прыязджаеш у войска як фотакарэспандэнт, людзей гэта скоўвае, яны нават асцерагаюцца цябе, — лічыць прызыўнік. — Іншая рэч, калі ты з'яўляешся часткай калектыву».



У сямейным архіве захоўваюцца фотаздымкі, зробленыя падчас службы ў войску бацькі і дзеда.

Сяргей спадзяецца, што ў арміі крыху скіне вагу. Усё ж такі дома харчуецца так, як страўнік падкажа, а гэта значыць, што халадзільнік можа адкрывацца нават ноччу. Армія, па словах хлопца, прывучыць яго да рэжыму. І гэта датычыцца не толькі харчавання. Ненармiраваны журналісцкі дзень, рэгулярныя камандзіроўкі часам вымушаюць вельмі рана ўставаць, а класціся далёка пасля поўначы.

— Вядома, буду сумаваць без свойскай ежы: мама любіць пабалаваць смачненькім, — прызнаецца наш калега. — Але я не пераборлівы, прызвычаюся да любога харчавання.

Безумоўна, як і любому хлопцу, яму хутчэй хочацца авалодаць стралковай зброяй. Пэўны вопыт, дарэчы, ёсць. І размова ідзе нават не пра школьныя ўрокі дапрызыўнай падрыхтоўкі. Сяргей жартуе, што за гады працы ў «Звяздзе», у прыватнасці падчас камандзіровак па вайсковых часцях, ён пастраляў больш, чым любы салдат тэрміновай службы. Сама бачыла: трапляў у цэль не толькі з пісталета Макарава і аўтамата Калашнікава — па сілах фотакару і гранатамёт!



За святочным сталом. Тут — самыя любімыя стравы будучага вайскоўца.

### ДА СЛУЖБЫ ГАТОВЫ!

Чацвер. Раніца каля ваенкамата Маскоўскага раёна. Бацькі даюць Сяргею апошнія парады, перапытваюць, ці ўсё ўзяў з сабой. Акрамя ўсяго неабходнага, у заплечніку — бутэрброды: у войску хлопцы сёння толькі павячэраюць.

— У нас вельмі моцны і сур'ёзны сын, — у адзін голас кажуць Нікановічы. — Нават калі ён хвалюецца, то не паказвае гэтага. Трымаецца, як сапраўдны мужчына. А армія зробіць з яго яшчэ і абаронцу — ва ўсіх сэнсах гэтага слова.

У Мінскім гарадскім ваенным камісарыяце, куды разам з нашым калегам прывезлі прызыўнікоў з іншых ваенкаматаў сталіцы, шматлюдна. Пакуль хлопцы праходзяць кантрольны медагляд, за сваімі навабранцамі пад'язджаюць прадстаўнікі вайсковых часцей, дзе тыя будуць праходзіць службу.

Сяргееву прыгоднасць да службы па здароўі ўрачы прызналі ўжо даўно, але раптам прызыўнік сябе дрэнна адчувае альбо ў апошнія дні перад адпраўкай нешта здарылася — лепш падстрахавацца. Лор, акуліст, псіхатэрапеўт, неўролаг, хірург, стаматолаг, дэрматолаг, тэрапеўт — адну за адной Сяргей адчыняе дзверы з адпаведнымі шыльдамі. Нарэшце, вердыкт — можа служыць!

Пакуль чакае ад'езду ў 2-ю інжынерную брыгаду, ёсць час пагутарыць. Спаў ён сёння ад сілы тры гадзіны. Прызнаецца, што амаль як перад камандзіроўкай: ведае, што ў аўтобусе адаспіцца. Сяргей ужо паспеў пазнаёміцца з некаторымі хлопцамі. «Калі ехалі сюды, нехта сказаў, што сёння яшчэ арганізацыйныя моманты, але ўжо заўтра ў шэсць гадзін раніцы мы ўстанем і будзем маршыраваць, — кажа ён. — Напэўна, пасля гэтых слоў усе ўсвядомілі, што заўтра пачнецца новае жыццё. Вельмі цікава, ужо нават азарт з'явіўся: хутчэй хачу даведацца пра армію знутры».

Відаць, што Сяргей будзе сумаваць па рабоце. Яму вельмі хочацца падысці да нас, узяць у рукі фотаапарат, але сёння ён — па-іншы бок аб'ектыва. «Пазіраваць і адказваць на пытанні так дзіўна! — прызнаецца прызыўнік. — Таксама быццам да гэтага датычны, але я ўжо не з вамі...»

Сяргей здаў сваё пасведчанне прызыўніка. Ужо сёння ён атрымае ваенны білет. «Ніяк не дачакаюся гэтага моманту: ужо набыў для яго прыгожую вокладку», — кажа на развітанне. Хутка ўбачымся на прысязе! А пакуль — добрай службы, вайсковец!

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

***Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by***

## ■ Камунальныя стасункі

# Жыроўка ў рэжыме анлайн

Што трэба зрабіць, каб жыроўка прыходзіла на электронную пошту

**Беларусы могуць атрымліваць жыроўку не толькі ў папяровым фармаце, але і ў электронным выглядзе. Плацежка павінна прыйсці не пазней за 15-е чысло. Як перайсці на электронную жыроўку, расказала начальнік аддзела па рабоце з насельніцтвам філіяла «Адзіны разлікова-даведачны цэнтр горада Мінска» Вольга РАЗУМАВА.**

Для атрымання плацежнага дакумента па электроннай пошце ўласніку жылога памяшкання (наймальніку жылога памяшкання дзяржаўнага жыллёвага фонду камерцыйнага выкарыстання) неабходна звярнуцца ў разлікова-даведачны цэнтр раёна па месцы жыхарства і напісаць заяву з пазначэннем неабходных асабістых даных і электроннага адраса. Пры сабе трэба мець пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу. У заяве трэба выбраць варыянт атрымання квітанцыі аб аплаце за ЖКП толькі ў электронным выглядзе (па e-mail). Там жа трэба пазначыць месяц, з якога заяўнік жадае атрымліваць пасведчанне ў «электронцы». Перавагі адмовы ад папяровага варыянта — эканомія паперы, магчымасць атрымаць жыроўку аддалена, захоўваць яе ў электронным выглядзе і заўжды мець пад рукой.

**Цяпер перайсці на электронную жыроўку можна не толькі ў сталіцы, але ўвогуле ва ўсёй краіне.** Папярэдне пажадана звярнуцца ў мясцовы разлікова-даведачны цэнтр. Рэжым работы разлікова-даведачных цэнтраў раёнаў Мінска такі: панядзелак — пятніца з 08.00 да 20.00; субота з 08.00 да 17.00; выхадны — нядзеля.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

## Изменения в проектной декларации ООО «ДАТЧ СТАР», опубликованной в газете «Звязда» 05.12.2017 г. №234

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Держинского–ул. Щорса–ул. Железнодорожная–ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3» 3–4 пусковой комплекс.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

«Стоимость 1 кв. м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства: для **2** (двух) двухкомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от **57,98** до **64,71** кв. м, составляет от **1 000** до **1 280** долларов США, оплата производится в бел. руб. по курсу доллара НБ на дату оплаты.

Опубликованной в газете «Звязда» 05.12.2017 г. №234

«Многоквартирный жилой дом с подземной гараж-стоянкой (№1 по генплану в квартале пр. Дзержинского–ул. Щорса–ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенно-пристроенными объектами обслуживания населения» I очередь строительства, 6–11 секции, II очередь строительства, секции 1–3)» (I очередь строительства 5–6 пусковой комплекс).

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предлагаются:

«Стоимость 1 кв. м жилого помещения для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, на момент опубликования изменений в проектной декларации по договорам создания объекта долевого строительства: для 6 (шесть) однокомнатных квартир по принципу «свободной планировки» площадью от **40,88** до **48,48** кв. м, составляет от **1050** до **1300** долларов США, оплата производится в бел. руб. по курсу доллара НБ на дату оплаты.

4 (четыре) трехкомнатные квартиры по принципу «свободной планировки» площадью от **86** до **87,55** кв. м: стоимость 1 кв. метра от **1 000** до **1210** долларов США.

На предприятии действует система регулирования стоимости, зависимая от площади, этажа и условий оплаты строящегося жилого помещения».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу:**
г. Минск, ул. 3-я Щорса, 9, офис 505.
Тел.: +375 44 53 43 000, +375 29 53 43 000.

УНП 191061436

## Извещение о проведении повторного аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Алакарт-Дизайн», г. Минск, ул. Мясникова, д. 34, ком. 10 |
| **Лизингодатель** | ООО «Риетуму Лизинг», г. Минск, ул. Одоевского, д. 117, 6-й этаж, каб. 9 |

**Предмет аукциона:**

**право на заключение соглашения о перенайме по договору финансовой аренды (лизинга) №1802 от 9 апреля 2014 года на торговое помещение со следующими характеристиками:**

| **Наименование (назначение)** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес** |
|---|---|---|---|
| Торговое помещение | 405,9 кв. м | 500/D-683477 | г. Минск, ул. Якуба Коласа, д. 50, корп. 1, пом. 1Н |
| **Начальная цена с НДС 20%** | | **659 661,54 бел. руб. (снижена на 20%)** | |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на расчетный счет BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: Закрытое акционерное общество «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания соглашения о перенайме** | **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Дополнительная информация** | Дата заключения договора финансовой аренды (лизинга) – 9 апреля 2014 года. Срок лизинга – 60 месяцев. Соглашение о перенайме будет оформлено в виде дополнительного соглашения к договору лизинга |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания соглашения о перенайме, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) банковских дней** после заключения соглашения о перенайме

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения победителем торгов за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в г. «Звязда» от 03.11.2017

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **21.12.2017** в 11.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **19.12.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42; +375 29 183-69-71.** Email: auction@cpo.by. Интернет сайт www.cpo.by |

## Коммунальное унитарное предприятие «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» 26 декабря 2017 г. проводит открытый аукцион с условиями № 14-У-17 на право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений)

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены).
**Предмет аукциона:** право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на предоставляемом земельном участке, на котором находятся объекты, подлежащие сносу.
Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462.
На торги выставляется право проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений) на семи земельных участках в г. Минске, предоставляемых в аренду сроком на 5 лет:

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Наличие обременений | Ориентировочный размер убытков, причиняемых изъятием земельного участка и сносом расположенных на нем объектов недвижимости, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой | 0,49 | Для строительства объекта «Административный комплекс с подземным паркингом на пересечении ул. Либаво-Роменской и ул. Полевой» | 263 258,99 | 39 000,00 | 9 083,34 | Отселение и снос зданий и сооружений по ул. Либаво-Роменской, 3, 5 | 223 889,27 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 1 981,74 руб.* |
| 2 | г. Минск, пр. Партизанский, 77А | 2,2793 | Для строительства объекта «Комплекс административно-делового здания и гаража-стоянки (паркинга) с сопутствующими объектами торгово-бытового обслуживания по пр. Партизанскому, 77А» | 943 088,70 | 180 000,00 | 18 395,22 | Снос зданий и сооружений по пр. Партизанскому, 75А, 77, 77А, ул. Долгобродской, 44 | 2 308 745,20 |
| 3 | г.Минск ул. Будславская, 25 | 1,7 | Для строительства объекта «Объект производственного назначения по ул. Будславской, 25» | 207 486,01 | 30 000,00 | 12 132,03 | Снос зданий и сооружений, попадающих под пятно застройки (здания складов и объектов незавершенного строительства) до начала строительно-монтажных работ за счет застройщика | 927 299,83 |
| 4 | г. Минск в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 48 | 0,7931 | Для строительства объекта «Объект производственного назначения в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 48» | 131 464,55 | 20 000,00 | 9 702,63 | Снос зданий и сооружений, попадающих под пятно застройки, до начала строительно-монтажных работ | 212 673,12 |
| 5 | г. Минск в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 29. Участок №1 | 1,0 | Для строительства объекта «Объект производственного назначения в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 29. Участок №1» | 168 872,95 | 25 000,00 | 11 715,95 | Снос трех складских зданий. Демонтаж железобетонного и металлического ограждения | 152 464,38 |
| 6 | г. Минск в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 29. Участок №2 | 1,2 | Для строительства объекта «Объект производственного назначения в промузле Колядичи в районе ул. Бабушкина, 29. Участок №2» | 202 647,54 | 30 000,00 | 10 264,16 | Снос здания склада. Демонтаж железобетонного и металлического ограждения | 71 572,47 |
| 7 | г. Минск, ул. Надеждинская (участок №2) | 0,6836 | Для строительства объекта «Административный комплекс с паркингом по ул. Надеждинской» | 368 343,60 | 55 000,00 | 9 850,64 | Отселение и снос жилых и нежилых строений по ул. Надеждинской, 36, 38, 40, 42, попадающих под пятно застройки | 940 800,00 Возмещение потерь сельскохозяйственного производства в размере 10 763,25 руб.* |

* Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету, а также актуализации с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения и соответствующего уровня инфляции.

Возмещение убытков и потерь сельскохозяйственного производства производится лицами, которым предоставляются изымаемые земельные участки.

Основные требования по проектированию и строительству объекта и условия предоставления земельного участка указаны в земельно-кадастровой и иной документации, подготовленной для проведения аукциона.

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках и их характеристики содержатся на планово-картографических материалах в составе земельно-кадастровой документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории участков осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями (согласно перечню, установленному Минским горисполкомом).

Аукцион состоится **26 декабря 2017 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Участниками аукциона могут быть юридические лица или индивидуальные предприниматели. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников – двух и более индивидуальных предпринимателей, юридических лиц.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток не позднее 20 декабря 2017 г.** в размере, указанном в графе 6 таблицы, перечисляемый на расчетный счет №BY18AKBB36410000000160000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBB BY 2X, УНП – 100690830, назначение платежа – 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома;

представить в коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (организатору аукциона) следующие документы:

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляется:

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

При подаче документов на участие в аукционе представители индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

При подаче документов уполномоченное лицо, которое будет представлять на аукционе стороны договора о совместном участии в аукционе и подписывать протокол о результатах аукциона, (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющей личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями, юридическими лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу:

г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. №6, с 7 декабря 2017 г. по 20 декабря 2017 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).

Торги в отношении земельных участков проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, аукцион признается несостоявшимся и земельный участок предоставляется такому лицу при его согласии с внесением платы за право заключения договора аренды земельного участка в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона**, в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан:

– внести плату за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре;**

** – единственный участник несостоявшегося аукциона также в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения об изъятии и предоставлении земельного участка обязан выполнить условия, предусмотренные в указанном решении, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

Оплата стоимости за право заключения договора аренды земельного участка осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона либо единственного участника несостоявшегося аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка.

После внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка (часть платы – в случае предоставления Минским горисполкомом рассрочки ее внесения), Минский горисполком заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор на реализацию права проектирования и строительства капитальных строений (зданий, сооружений).

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с землеустроительной и градостроительной документацией по земельным участкам (в том числе с характеристиками расположенных на земельных участках инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии) и условиями инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории). Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

**Контактный телефон: + 375 (17) 226-16-72, официальный сайт организатора аукциона: www.mgcn.by**

■ На думку філосафа



## Павел БАРКОЎСКІ:

# «ГЭТА ВЯЛІКІ МІФ, ШТО БЕЛАРУСЫ — ТАЛЕРАНТНЫЯ»

**На адным з кангрэсаў, прысвечаных надзённым пытанням беларускай рэчаіснасці, давялося пачуць выступленне пра паліткарэктнасць і ўпершыню задумацца, што гэта пытанне, хоць яго і можна лічыць часткай выключна заходняга дыскурсу, можа датычыцца нашай краіны таксама. Мы паслухалі і прыйшлі да высновы, што і сапраўды паліткарэктнасць, а дакладней, яе недахоп, а то і ўвогуле адсутнасць, — у тым ліку наша праблема. Аб гэтым ужо больш падрабязна пагаварылі з тым самым выступоўцам — філосафам, выкладчыкам БДУ і каардынатарам «Беларускай філасофскай прасторы» Паўлам БАРКОЎСКІМ.**

***— Павел, мне здаецца, дагэтуль паліткарэктнасць, што ўжо доўгі час знаходзіцца на хвалі абмеркавання, — у большай ступені «заходняя штучка». Наколькі гэтая хваля дасягнула Беларусі і ці з'яўляецца праблема паліткарэктнасці праблемай беларускага грамадства?***

— Паліткарэктнасць, якая сапраўды ў нашым усведамленні больш звязаная з Захадам, нам часта падаецца як кшталт новай цэнзуры ці дваядумства, калі чалавек разважае адным чынам, а мусіць выказвацца нейкім іншым. Гэта нагадвае савецкія часы, калі практыка грамадскага дваядумства існавала паўсюдна, таму пра паліткарэктнасць мы збольшага разважаем як пра заходні трэнд і лічым, прынамсі, на ўзроўні палітыкаў і грамадскіх дзеячаў, што для нас гэта не з'яўляецца праблемай. У нас мала грамадскіх арганізацый, якія б ставілі сабе за мэту выступіць за больш паліткарэктны дыскурс у публічнай прасторы. У заходніх краінах гэта стала элементам агульнай палітычнай праграмы, то-бок прасоўваецца на ўзроўні пануючых уладных груп. Хаця там цяпер існуе крыху іншы перакос: тое, што называюць феноменам Трампа, паказвае на тое, што маятнік скіраваўся ў іншы бок. Дональд Трамп пазіцыянуе сябе як чалавек, што нібыта гаворыць людзям праўду, якую іншыя палітыкі ад народа хаваюць. Там паліткарэктнасць — дзяржаўная ідэя, у людзей узнікае адчуванне, што ім яе спрабуюць навязаць, хаця пачыналася яна калісьці як грамадскі актывізм і пэўная інтэлектуальная тэорыя.

***— Мы толькі думаем, што гэта праблема для нас неактуальная?***

— На маю думку, наша грамадства мае праблемы з паліткарэктнасцю: беларусам уласціва публічна прамаўляць нешта ў ветліва-нейтральным тоне, а дома ці самому сабе дазваляць куды больш негатыўна афарбаваныя выказванні. Апошняе хутчэй і будзе выказваннем сапраўднай пазіцыі.

***— У нашым грамадстве няма выразнай, нават у СМІ, дыскусіі пра паліткарэктнасць. На чым вы будуеце сваю, так бы мовіць, канцэпцыю пра тое, што ў нас з гэтым праблемы?***

— У нашым грамадстве ўсталяваўся своеасаблівы тып камунікацыі: ён транслюецца зверху ўніз і з'яўляецца данінай савецкай манеры, разлічанай на аўтарытарна-дырэктыўны стыль, калі начальнік у размове з падначаленым дазваляе сабе непаліткарэктныя выказванні, бо ён нібыта галоўны, лепш ведае і таму для яго дапушчальная крытыка, нават вельмі рэзкая. Праз гэта транслюецца рыторыка не талерантная, а нібыта шчырай камунікацыі: бацькі крытычныя да дзяцей, дактары — да сваіх пацыентаў і гэтак далей. І калі сёння мы сутыкаемся з адносна новымі для беларусаў з'явамі, стаўленне да іх вельмі часта выразна негатыўнае, таму што апроч традыцыйных катэгорый, праз якія мы думаем пра свет, у нас няма магчымасцяў па-іншаму нешта ўсвядоміць. Напрыклад, вегетарыянства многія разглядаюць ледзь не як псіхічнае захворванне.

***— У такім выпадку, што мы маем на ўвазе пад паліткарэктнасцю? Яна застаецца на ўзроўні вонкавых зносін альбо ўключае ў сябе таксама талерантнасць ва ўсведамленні?***

— Гэта комплексная практыка, і датычыцца яна не толькі гаворкі. Бо якая ідэалогія стаіць за паліткарэктнасцю на Захадзе? Тое, як чалавек думае, праяўляецца ў мове. Адпаведна, калі чалавек пагардліва выказваецца ў бок некага, ён не можа па-іншаму да яго адносіцца ў рэальнасці. Калі мы хочам нешта змяніць, змяняць трэба таксама на ўзроўні мазгоў, а значыць, трэба хаця б на бачнай частцы стасункаў прапаноўваць адпаведныя моўныя падыходы да рэчаіснасці, якія б не мелі негатыўнай і абразлівай афарбаванасці. І праз змяненні ў мове змяняць рэальнасць.

***— Сам працэс падбірання больш ветлівага слова ў адносінах да тых жа людзей з абмежаванымі магчымасцямі — гэта ўжо акцэнтаванне ўвагі на адрознасці гэтага чалавека. А калі ты акцэнтуеш увагу на адрознасці, ты ўжо быццам прымаеш чалавека не за роўнага сабе.***

— Адрознасці можна ўспрымаць па-рознаму. Мы з вамі таксама адрозныя, але гэта не замінае нам камунікаваць, а часам нават дапамагае. Калі вы размаўляеце з іншым чалавекам і ягоны стан не з'яўляецца нагодай, каб падкрэсліць яго як факт няроўнасці — я нешта магу, а ты не можаш, — тады падбор адпаведнага слова будзе проста спосабам больш далікатнай камунікацыі. Тым больш вы будзеце да свайго суразмоўцы звяртацца па імені, а не як да «чалавека з абмежаванымі магчымасцямі».

***— Вы можаце прыгадаць шаблоны лексічных адзінак, з якімі ў нас ёсць праблемы?***

— Канфлікт ва Украіне нарадзіў словы кшталту «ватнік» і «вышыватнік». У бок дзяцей, як адзнаку патрыярхальнай культуры, можна пачуць мянушкі «сапляк» ці нешта накшталт гэтага. «Дурні, няўмехі і ёлупні» — гэта формы начальніцкай крытыкі. Нават знакаміты так званы дэкрэт пра дармаедаў, магчыма, выклікаў грамадскае абурэнне найбольш праз гэту нефармальную назву. Людзі, якія страцілі або не могуць знайсці працу не па сваёй волі, не адчуваюць сябе дармаедамі, у сэнсе абібокаў ці тых, хто вісіць на шыі ў грамадства, таму лічаць гэта для сябе абразай. Магчыма, калі б гэты дэкрэт у грамадстве называлі ў іншай фармулёўцы, такога вялікага розгаласу ён бы не атрымаў.

***— Выходзіць, калі ў нас няма яскравай дыскусіі вакол тэмы паліткарэктнасці, значыць, і з талерантнасцю ў нас не ўсё добра?***

— Так, гэта вялікі міф, што беларусы — талерантныя. Пасля распаду Савецкага Саюза мы зрабілі яго ледзьве не нацыянальным брэндам, але наша талерантнасць збольшага базуецца на стэрэатыпе, што беларусы — лагодны і памяркоўны народ, які пасля доўгіх вякоў цярпімасці гатовы прымаць любыя формы жыцця. Насамрэч у беларусаў пануюць кансерватыўна-традыцыйныя ўяўленні, якія перашкаджаюць прымаць адрозныя неўнармаваныя формы мыслення ці паводзін. Гэта адчуваецца, калі мы абразліва адзываемся пра людзей, якія не адпавядаюць нашым стэрэатыпам. Іншая справа, што ў якасці грамадскай праблемы гэта пакуль не ўспрымаецца, бо праблема павінна быць сфармуляваная самім грамадствам ці, прынамсі, грамадскімі арганізацыямі. Паказальная сітуацыя з гей-парадамі, якія мелі месца ў Мінску ў мінулыя гады: цікава, што шмат хто з палітыкаў з супрацьлеглых лагераў аднолькава адмоўна паставіўся да гэтай ідэі і выказаў сваю пазіцыю публічна. Таму стаўленне да гэтай праблемы нельга патлумачыць чыста ідэалагічнымі прычынамі, прыкладам.

***— Якія сацыяльныя колы больш за ўсіх «церпяць» у беларускім грамадстве?***

— Сітуацыя ў Беларусі прыблізна адпавядае агульнай сусветнай: безумоўна, гэта людзі нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыі ці людзі з прыкметамі фізічнага калецтва альбо, як паліткарэктна зараз кажуць на Захадзе, людзі з абмежаванымі магчымасцямі. Гэта ў тым ліку і жанчыны, якія церпяць ад дамашняга гвалту і проста зневажальна-апякунскіх мянушак, бо беларускае грамадства да сёння досыць патрыярхальнае. Напрыклад, калі нехта называе сваю жанчыну бабай, мы разумеем, што гэта ўжо не даніна традыцыі, а зневажальнае слова, якое паказвае, што па патрыярхальнай логіцы мы не заўсёды гатовыя не пабпажліва ставіцца да сваіх партнёрак ці жонак, да іх разумовых здольнасцяў або сацыяльнага статусу.

***— А што наконт стаўлення да замежнікаў альбо падзялення па рэлігійнай прыкмеце?***

— Тут я магу абапірацца амаль што толькі на ўласныя ўражанні, але што датычыць замежнікаў, сітуацыя шмат у чым неўнармаваная. З аднаго боку, праяўляюцца патрыярхальна-кансерватыўныя настроі беларусаў: замежнікі, што вонкава адрозніваюцца ад нас, выклікаюць павышаную цікавасць і насцярожанасць. Для сучасных пакаленняў гэта, відаць, пачалося з «дзяцей алімпіяды» — часоў, калі жыхары афрыканскіх краін былі частымі гасцямі ў Савецкім Саюзе, і працягваецца да сёння ў форме прыхаванай ксенафобіі. Традыцыйна падазронае стаўленне да жыхароў азіяцкіх краін. Мне вядомы выпадак, калі людзі ледзь не пачалі прымаць нейкія захады, калі даведаліся, што ў іх доме арандаваў кватэру сірыец. Я не кажу, што гэта агульная сітуацыя, але дакладна мы не гатовыя наўпрост прымаць тых жа мігрантаў. Нават да ўкраінскіх перасяленцаў, хаця яны да нас найбольш блізкія, стаўленне досыць амбівалентнае на ўзроўні масавых стэрэатыпаў, маўляў, яны хітрыя, гультаяватыя, любяць падседзець беларуса і так далей. З рэлігіяй у нас крыху прасцей, хаця мае калегі, якія займаюцца сацыялагічнымі даследаваннямі, сустракаюцца з тым, што існуюць часам не канфлікты, але досыць напружаныя адносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі, праваслаўнымі і ўніятамі, праваслаўнымі і пратэстантамі. Праўда, на фоне іншых краін у нас у гэтым плане спакойна.

***— Як прыклад непаліткарэктнасці можна ўзгадаць слова «жыд»... Як мы ставімся да яўрэяў?***

— Гэтае слова апошнім часам стала прадметам грамадскай палемікі, прычым не з ксенафобскіх пазіцый, а з пазіцый літаратурнай нормы, бо частка беларускамоўнай публікі выкарыстоўвае слова «жыд» як традыцыйнае, якое не мае зневажальнага характару, а частка адчувае ўплыў рускай мовы, дзе гэтае слова стала адназначна дыфаматыўным эпітэтам. Натуральна, з пункту гледжання паліткарэктнасці, лепш у такім разе карыстацца такім азначэннем, якое не выклікае абурэння ў паасобных прадстаўнікоў гэтай нацыі, нягледзячы на ўсе магчымыя рэзоны.

***— Мне прыйшло ў галаву, што ў нашым грамадстве ёсць унікальныя суб'екты, калі можна так сказаць, паліткарэктнасці: рускамоўныя і беларускамоўныя.***

— Гэта, напэўна, вельмі драматычна, што моўнае пытанне ў нас дагэтуль палітызавалася. Сёння можна сустрэць як з боку свядома рускамоўнага абразлівыя выказванні ў бок беларускамоўнага, так і наадварот. Канешне, гэта таксама не плюс нашай талерантнасці. Але пастулова, мне здаецца, тэндэнцыя змяняецца, і колькасць людзей, якія, калі і не ўжываюць дзве мовы запар, то хаця б талерантна ставяцца да іншай, павялічваецца. На ўсіх узроўнях — ад чыноўнікаў да спецыялістаў розных прафесій, нават у прыватных стасунках. Радыкальнага непрыняцця, як на пачатку 1990-х, калі супрацьстаялі «былыя савецкія людзі» і «новыя беларускія нацыяналісты», больш няма, хаця сімвалічныя рэшткі былых «войнаў» яшчэ застаюцца і лакальныя «бойкі» пакуль, на жаль, вядуцца.

***— У параўнанні з Еўропай, дзе на хвалі крызісу з бежанцамі людзі пачалі выступаць супраць перасяленцаў, мы, напэўна, выглядаем добра.***

— Праз Беларусь таксама праходзяць міграцыйныя шляхі, і нядаўняя сітуацыя з чачэнцамі, што вымушаны былі доўгі час жыць на вакзале ў Брэсце, — толькі адна з вяршыняў айсберга. Да тых, каго беларусы, як і нашы суседзі з Усходу, называюць «чорнымі», стаўленне рознае. Калі справа датычыцца канкурэнцыі ў працы, натуральна, беларусы выказваюцца менш талерантна. А звычайна мясцовыя жыхары часта паўтараюць агульную рыторыку наконт пагрозы з боку людзей неславянскай знешнасці з іх небяспечнай рэлігіяй.

***— Калі адсутнасць паліткарэктнасці лічыць праблемай, то праблему трэба вырашаць і пачынаць, напэўна, варта не з вонкавых стасункаў, не з лексікі, а са свядомасці.***

— Насамрэч няма вонкавага ці ўнутранага, бо нашы свядомасць і мова цесна паяднаныя. Калі мы хочам нешта змяніць, трэба рабіць гэта на абодвух узроўнях. Калі на Захадзе паліткарэктнасць свядома прасоўваецца праз усе грамадскія інстытуты, чалавек на ўсіх узроўнях камунікацыі прывычайваецца да не агрэсіўнага, а хаця б нейтральнага прамаўлення. Калі ён замест «калека» пачынае гаварыць «чалавек з абмежаванымі магчымасцямі», ён змяняе сваё стаўленне і на ўзроўні думак.

***— Вы ж казалі, што для беларуса гэта нармальна: публічна выказвацца адным чынам, а дома — іншым.***

— У беларуса ёсць культура ветлівасці, якая заклікае да нейтральнага тону ў камунікацыі і патрабуе, каб некаторыя словы, напрыклад «інвалід», вы не казалі ў твар. Затое за спінай маглі б сабе гэта лёгка дазволіць. А культура паліткарэктнасці не баіцца прамаўляць гэтыя рэчы публічна, але спрабуе даваць ім іншыя імёны, якія б не дазвалялі разгарэцца пагардліваму стаўленню да чалавека. Праз гэта яна вучыць людзей не баяцца гаварыць на далікатныя тэмы, асноўная ж праблема беларусаў у тым, што мы баімся балючых пытанняў і далікатных тэм, мы іх замоўчваем. Усё ж, напрыклад, нетрадыцыйнай арыентацыі для нас нібыта не існуе. Ці існуе выключна як прыкрая паталогія, якую нельга даравань іншаму чалавеку, і таму мы альбо маўчым, альбо абражаем.

***— І наступствы гэтага...***

— Па-першае, падвойная мараль, калі ты думаеш адно, а кажаш іншае. Па-другое, кожная праблема рана ці позна выходзіць вонкі, пытанне толькі, у якіх формах. Чым больш мы ў сабе кансервуем прыхаваныя праблемы, тым, магчыма, большым рэхам яны нам адгукнуцца ў будучыні. Гэта потым можа стаць прычынай куды большай грамадскай спрэчкі і больш значнага грамадскага супрацьстаяння, чым тое адбываецца ў заходніх краінах зараз.

**Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

*katsyalovich@zviazda.by*

■

Сумесны выпуск газеты «Звязда»
і Міністэрства прыродных рэсурсаў
і аховы навакольнага асяроддзя
№ 12 (28)

# НЕБЯСПЕЧНЫ

Зімовы сезон — адзін з самых складаных перыядаў для аўтамабілістаў. Перапады тэмператур і ападкі пагаршаюць бачнасць і счапленне з дарогай, павышаюць рызыку аварыйных сітуацый. Каб вырашыць гэтыя праблемы, дарожныя і камунальныя службы апрацоўваюць дарогі і вуліцы спецыяльнымі рэагентамі. Але, дапамагаючы аўтамабілістам, хімічныя рэчывы могуць забрудзіць наваколле і прынесці шкоду раслінам.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Лёд пад кантролем

Для зімняга ўтрымання аўтамабільных дарог агульнага карыстання (рэспубліканскіх і мясцовых у Беларусі) выкарыстоўваецца тэхнічная соль (хлорысты натрый, NaCl) у чыстым выглядзе і яе сумесі з пяском у розных прапорцыях. Соль, якая прымяняецца на дарогах краіны, — галітавыя адходы калійнай вытворчасці. Яна расплаўляе ледзяное ці тонкае снежнае покрыва на дарожным пакрыцці, а пясок дапамагае аўтамабілям разбурыць снежна-ледзяныя адкладанні.

Як расказаў **начальнік упраўлення бяспекі і ўтрымання аўтамабільных дарог Беларускага дарожнага навукова-даследчага інстытута «БелдарНДІ» Сяргей КАБАК**, у адрозненне ад краін Заходняй Еўропы і Скандынавіі, клімат Беларусі зімой больш разнастайны. За зіму фіксуецца да 80—100 выпадкаў пераходу тэмпературы цераз 0 °С, што павышае колькасць галалёдных з'яў і выклікае неабходнасць выкарыстання супрацьгалалёдных матэрыялаў. Нормы іх расходу разлічваюцца ў залежнасці ад тэмпературы паветра, віду, таўшчыні і шчыльнасці снежна-ледзяных адкладанняў. Так, напрыклад, да зімняга сезона 2017—2018 гадоў арганізацыі рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі нарыхтавалі больш за 330 тысяч тон пясчана-саляной сумесі, а таксама каля 100 тысяч тон чыстай солі.

Уздоўж рэспубліканскіх дарог размешчаны 185 дарожна-вымяральных станцый, якія даюць аператыўную інфармацыю пра ўмовы

■ Міжнароднае супрацоўніцтва

## Экалогія — інвестыцыі ў будучыню

### У Мінску абмяркоўвалі супрацоўніцтва ў прыродаахоўнай сферы паміж Беларуссю і Расіяй

**Часта абедзве краіны ідуць адным шляхам у вырашэнні экалагічных праблем — у гэтым пераканаліся ўдзельнікі экспертна-медыйнага семінара «Актуальныя пытанні забеспячэння экалагічнай бяспекі ў Саюзнай дзяржаве. Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў прыродаахоўнай сферы», якія праходзіў у Мінску напрыканцы лістапада.**

«Выбар тэмы семінара не выпадковы, — адзначыў **Андрэй БРЫГАДЗІН, саветнік прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску.** — Экалагічная бяспека становіцца ўсё больш актуальнай тэмай Саюзнай дзяржавы і сусветнай супольнасці. Экалогія напрамую ўплывае на кожнага чалавека, на дэмаграфічную, харчовую, у канчатковым выніку на эканамічную бяспеку дзяржавы».

Беларусь з'яўляецца бокам каля 25 міжнародных дагавораў і канвенцый, якія датычацца экалагічнай бяспекі. Наша краіна актыўна супрацоўнічае ў гэтай сферы з міжнароднымі арганізацыямі, Еўрасаюзам, атрымліваючы ад іх, у тым ліку, фінансавую дапамогу для рэалізацыі шэрагу праектаў.

«Экалогія — гэта не выдаткі, а інвестыцыі ў будучыню», — падкрэсліла **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Ія МАЛКІНА** і нагадала пра Дзяржаўную праграму «Ахова навакольнага асяроддзя і ўстойлівае выкарыстанне прыродных рэсурсаў» на 2016—2020 гады і Нацыянальны план дзеянняў па развіцці «зялёнай» эканомікі. Ія Малкіна адзначыла, што наладжана цеснае і эфектыўнае супрацоўніцтва паміж Белгідраметам і Расгідраметам, і выказала надзею, што расіяне адгукнуцца на нашу просьбу папрацаваць сумесна ў сферы абыходжання з адходамі.

Першы намеснік начальніка Белгідрамета Марыя Гермянчук расказала пра сумесную работу з расійскімі калегамі: абмен інфармацыяй аб гідраметэаралагічных параметрах ідзе ў рэжыме рэальнага часу. Падрыхтоўка якаснага прагнозу істотна залежыць ад абмену інфармацыяй паміж суседзямі. Генадзь Елісееў, намеснік дырэктара па навуцы Расгідрамета, нагадаў, што яшчэ ў СССР беларускія калегі былі на перадавых пазіцыях.

Вострую праблему закрануў Філіп Гулый, старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі. Ён адзначыў, што ў нашай краіне нядрэнна развіваецца экалагічны турызм. Сярод расіян папулярныя нашы аграэкасядзібы, нацпаркі. Па словах эксперта, раней да нас з суседняй краіны прыязджалі групы школьнікаў, каб убачыць, як растуць грыбы, ягады, то-бок ішла гаворка аб арганізацыі адукацыйнага турызму для дзяцей. Цяпер жа, як гаворыць Філіп Гулый, ёсць негалосная забарона на выезд студэнтаў і школьнікаў з прыгранічных раёнаў Расіі ў Беларусь — такім чынам ствараюцца штучныя перашкоды на шляху натуральных падарожжаў расійскай моладзі.

Удзельнікі семінара наведалі рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства, Белгідрамет, а таксама прынялі ўдзел у цырымоніі ўзнагароджання пераможцаў конкурсу маладых настаўнікаў Расіі і Беларусі «Люблю Геаграфію».

**Аксана ЯНОЎСКАЯ**
*yanovskaya@zviazda.by*

■ Падпіска-2018

## ЧЫТАЙ І ЛЮБУЙСЯ!

Паважаныя чытачы! Сённяшні выпуск дадатку «Карані і кроны» — апошні ў 2017 годзе. Але мы ўпэўнены, што карысная экалагічная інфармацыя з'явіцца ў газеце «Звязда» і ў новым, 2018-м, годзе. А пакуль вы чакаеце чарговыя выпускі дадатку, раім пачытаць і часопіс «Родная прырода», дзе мы пастараліся сабраць цікавыя праблемныя матэрыялы, найлепшыя «зялёныя» парады і не знаёмыя вам факты пра прыроду Беларусі.




**Падпісацца на газету «Звязда» і часопіс «Родная прырода» на першае паўгоддзе 2018 года можна да 25 снежня. Выпісвайце любімыя выданні, каб заўсёды быць у курсе экалагічных навін Беларусі і свету, новаўвядзенняў прыродаахоўнай палітыкі дзяржавы, важных прыродаахоўных ініцыятыў нашых землякоў, а таксама самому навучыцца дапамагаць наваколлю.**

**Будзьце разам з роднай прыродай!**

■ Тэма нумара

# «ІНЕЙ»

## Якую шкоду праслiннаму свету наносяць супрацьгалалёдныя рэагенты

надвор'я і стан дарожнага палатна на канкрэтным участку. Сёння дарожныя службы ўсё часцей выкарыстоўваюць прэвентыўныя апрацоўкі, якія дазваляюць прадухіліць утварэнне галалёду.

Што ж датычыцца вуліц гарадоў і іншых населеных пунктаў, то яны не адносяцца да дарог агульнага карыстання. І планаванне дарожнай дзейнасці на іх ажыццяўляецца мясцовымі ўладамі. Так, напрыклад, за станам вулічнай сеткі сталіцы і МКАД сочаць прадпрыемствы гарадскога «Гаррамаўтадара». Пры гэтым, па словах Сяргея Кабака, некаторыя нарматыўныя дакументы, распрацаваныя БелдарНДІ для аўтамабільных дарог, не могуць брацца за аснову для ўтрымання вуліц населеных пунктаў — з-за розніцы ўмоў (інтэнсіўнасці руху, кліматычных характарыстык і інш.).

### Шкода дрэвам і глебе

Выкарыстанне солі ў якасці супрацьгалалёднага рэагенту, асабліва з перавышэннем гранічных нормаў і ў спалучэнні з іншымі негатыўнымі фактарамі, непазбежна вядзе да аслаблення і дэградацыі прыдарожных экасістэм, расказаў **загадчык сектара маніторынга расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Аляксандр СУДНІК.**

Турбулентныя патокі паветра, што ствараюцца транспартам, які рухаецца, садзейнічаюць распаўсюджанню водна-салявых аэразоляў уверх і іх асяданню на іглiцы і парастках дрэў (вышыня пашкоджання крон дрэў у сярэднім дасягае 15—17 м над узроўнем палатна дарогі). Соль выклікае абязводжванне і пашкоджванне раслін, у іх могуць узнікнуць салявы апёк, адставанне ў росце і развіцці, заўчаснае ападанне лісця. Найбольшы негатыўны ўплыў адчуваюць дрэвы, якія растуць на ўзлесках, а таксама маладняк і падлесак у непасрэднай блізкасці (3—20 м) ад аўтадарог.

— Рэагенты пашкоджваюць не лісце, а вегетатыўныя пупышкі дрэў, што растуць каля аўтадарог, — расказаў Аляксандр Суднік. — Гэта прыводзіць да ўтварэння «разетачнасці» вегетацыйных парасткаў. Хларыды выклікаюць парушэнні ў розных сістэмах жыццядзейнасці раслін, у выніку дрэвы і хмызнякі аслабляюцца і нават гінуць.

Супрацьгалалёдныя рэагенты забруджваюць не толькі дрэвы, але і глебы. Хларыды мяняюць іх кіслотнасць, ускладняецца паступленне ў расліны вады і пажыўных рэчываў. Акрамя засалення прыдарожных глебаў, назіраецца і такі новы працэс, як фарміраванне саланцаватасці.

### Ці ёсць альтэрнатыва?

Пакуль соль застаецца найбольш распаўсюджаным супрацьгалалёдным матэрыялам у Еўропе. У многіх краінах выкарыстоўваюцца солі хларыдаў у чыстым выглядзе, а таксама ў выглядзе расолаў ці ў складзе пясчана-саляных сумесяў. Тым не менш узрастанне патрабаванняў экалагічнай бяспекі і каразійнае дзеянне соляў на элементы дарог і аўтамабільны транспарт абмяжоўваюць вобласць іх прымянення.

— Ёсць шэраг матэрыялаў, каразійна не актыўных і больш экалагічна бяспечных (напрыклад, апрацоўка пакрыцця спіртам), аднак іх кошт на некалькі парадкаў вышэйшы. Так, у асобных краінах выкарыстоўваюць ацэтаты магнію і кальцыю, яны не каразіруюць метал, аднак іх здольнасць плавіць лёд ніжэйшая, меншы і рабочы тэмпературны дыяпазон, а кошт — нашмат большы, — адзначыў Сяргей Кабак.

**По даных даследаванняў, праведзеных у 2017 годзе, з усёй сукупнасці абследаваных лясных насаджэнняў уздоўж магістральных дарог доля дрэў без прыкмет аслаблення склала ўсяго 28,57%.**

Перспектыўнай тэхналогіяй лічыцца выкарыстанне саляных раствораў. Згодна з замежнымі даследаваннямі ўвільготненая соль лепш замацоўваецца на дарожнай паверхні з зімовай слізкасцю і больш эфектыўная, чым сухая. Гэта робіць ніжэйшай верагоднасць выкіду супрацьгалалёднага матэрыялу з праезнай часткі, значыць, зніжаюцца і экалагічныя рызыкі. Такія тэхналогіі, паралельна з іншымі метадамі, выкарыстоўваюць у Латвіі, Эстоніі, Фінляндыі, Германіі, Аўстрыі, Ісландыі і інш. Асноўная цяжкасць пераходу на прымяненне раствораў солі ў Беларусі — у адсутнасці неабходнага абсталявання.

Але ці можна ўвогуле адмовіцца ад выкарыстання супрацьгалалёдных рэагентаў і замест гэтага проста больш часта прыбіраць снег з вуліц? Сяргей Кабак упэўнены: гэта моцна павялічыць колькасць уборачнай тэхнікі на вуліцах або частату яе праездаў і зменшыць хуткасць на дарогах населеных пунктаў.

— На жаль, у найбліжэйшай перспектыве альтэрнатыўнай замены супрацьгалалёдных матэрыялаў на аснове хлорыстага натрыю няма з-за цаны апошняга, а таксама яго павышанай здольнасці плавіць лёд, — падкрэсліў Сяргей Уладзіміравіч.

Па словах Аляксандра Судніка, праблема не толькі ў выкарыстанні непасрэдна натрыю хлору, але і ў аб'ёмах, якія высыпаюцца на нашы дарогі і вуліцы. Соль выкарыстоўваецца ў нашай краіне з 1960-х гадоў. Але яе колькасць у агульнай масе супрацьгалалёдных рэагентаў раней складала толькі 10%. У апошнія ж гады перайшлі практычна на чыстую соль, і такое ігнараванне нормаў пасыпак прыводзіць да гібелі насаджэнняў уздоўж дарог.

— Калі па нарматывах аб'ём унясення супрацьгалалёдных рэагентаў на МКАД не павінен перавышаць 5 тысяч тон за зімні перыяд, то колькасць рэагентаў перавышала гранічную норму ў 1,3—2,2 раза, — адзначыў навуковец. — У нарматыўным дакуменце, зацверджаным у 2000 годзе, было ўстаноўлена, што «колькасць размяркоўваемай за зімовы перыяд тэхнічнай солі не павінна перавышаць 2 кг/м² пакрыцця». Але ў 2009 годзе прыняты новы тэхнічны нарматыўна-прававы акт, дзе нормы ўнясення супрацьгалалёдных рэагентаў невызначаныя, і гэтым карыстаюцца тыя, хто гэтыя нормы свядома перавышае.

У многіх заходнееўрапейскіх гарадах, а таксама ў Маскве, практыкуецца выкарыстанне пясчана-саляных сумесяў на аснове хларыду кальцыю ($CaCl_2$). Вышыня падняцця турбулентнымі патокамі водна-салявых аэразоляў на яго аснове значна меншая — 0,5—1 м, і пікі забруджвання прыходзяцца на тэрыторыю непасрэдна каля аўтадарогі. У Фінляндыі, напрыклад, выкарыстоўваюць гранітную крошку, якую пасля зімы збіраюць.

### Менш солі, больш устойлівых дрэў

Паколькі ў найбліжэйшай перспектыве ад выкарыстання солі ў якасці рэагентаў наша краіна, на жаль, не зможа адмовіцца, сёння трэба працаваць у кірунку павышэння стану лясных біяцэнозаў і ахоўных насаджэнняў, лічыць Аляксандр Суднік. Для гэтага вучоныя Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча цесна супрацоўнічаюць са спецыялістамі БелдарНДІ ў распрацоўцы і ўдасканаленні нарматыўных дакументаў, якія датычацца зімняга ўтрымання аўтамабільных дарог.

Спецыялісты таксама распрацавалі рэкамендацыі па павышэнні ўстойлівасці прыдарожных насаджэнняў. Сярод іх:

— прывядзенне аб'ёму прымянення галіту ў якасці супрацьгалалёднага рэагенту ў адпаведнасць з нарматывамі і прытрымліванне існуючых патрабаванняў па ўтрыманні аўтадарог;

— ужыванне альтэрнатыўных, менш агрэсіўных у адносінах да прыроднай расліннасці, супрацьгалалёдных рэагентаў;

— трансфармацыя адносна малаўстойлівых чыстых і аднаўзроставых дрэвастояў у больш устойлівыя змяшаныя і рознаўзроставыя;

— захаванне і ўвядзенне парод дрэў, устойлівых да тэхнагенных выкідаў і засалення глебаў;

— правядзенне пошукавых работ па рашэнні праблемы ўсыхання драўняных насаджэнняў;

— выкарыстанне ва ўзлесках на найбольш небяспечных участках аўтамагістраляў ахоўных экранаў ці 1—2 шэрагаў штучных дрэў для абароны лясных масіваў ад уздзеяння саляных завісяў і інш.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

**Дакументы, якімі кіруюцца дарожныя службы падчас зімовага абслугоўвання дарог:**

✓ СТБ 1291—2016 «Дарогі аўтамабільныя і вуліцы. Патрабаванні да эксплуатацыйнага стану, дапушчальнага па ўмовах забеспячэння бяспекі дарожнага руху».

✓ СТБ 1158—2013 «Матэрыялы супрацьгалалёдныя для зімовага ўтрымання аўтамабільных дарог. Агульныя тэхнічныя ўмовы».

✓ ТКП 100—2011 «Парадак арганізацыі і правядзення работ па зімовым утрыманні аўтамабільных дарог».

■ Экатэхналогіі

# Людзі на балоце — дабрабыт прыродзе

## Як арганізацыя «балотнай гаспадаркі» дапамагае не толькі палепшыць экалагічную сітуацыю і адаптавацца да змены клімату, але і павялічыць эканамічны патэнцыял рэгіёнаў



**Праект «Кліма-Іст: захаванне і ўстойлівае кіраванне тарфянікамі ў Рэспубліцы Беларусь дзеля скарачэння выкідаў вугляроду і адаптацыі балотных экасістэм да змены клімату» фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Балоты — гэта не толькі прыроднае багацце нашай краіны, але і тэрыторыі вялікай адказнасці, бо з'яўляюцца аднымі з самых уразлівых экасістэм на планеце. Парушэнне гідралагічнага рэжыму, а таксама спыненне выкарыстання гэтых біятопаў чалавекам для ручной касьбы і выпасу жывёлы прывялі да зарастання адкрытых прастораў драўнінна-хмызняковай расліннасцю і трыснягом. Гэтым працэс закрануў да 500 тысяч га натуральных балот і нізінных пойменных лугоў, у тым ліку і на пілотных тэрыторыях праекта — заказніках «Спораўскі» і «Званец». Каб наблізіць іх да першапачатковага выгляду, падтрымаць біялагічную разнастайнасць і зменшыць выкіды парніковых газаў, і была арганізавана «балотная гаспадарка». Сутнасць апошняй, па словах кіраўніка праекта «Кліма-Іст» Уладзіміра Калтунова, — у выдаленні часткі натуральнай расліннасці і выкарыстанні яе ў энергетычных, будаўнічых, сельскагаспадарчых і іншых мэтах.

Падчас рэалізацыі праекта ў заказніках «Спораўскі» і «Званец» на плошчы 3893 га арганізавана зразанне хмызнякоў, трыснягу і касьба травы. Усе работы праводзіліся ў пэўны час і з дапамогай спецыялізаванай, закупленай для праекта тэхнікі, каб не нашкодзіць іншым раслінам і жывёлам. У выніку нарыхтавана 4062 тоны раслінай біямасы: травяністая пайшла на сена, сянаж і сілас, драўнка і дровы выкарыстоўваліся як паліва, а здробленыя ліставыя пароды — у якасці мульчы.

На тэрыторыі заказніка «Званец» на плошчы каля 5 тысяч га ўпершыню ў краіне было праведзена кіруемае выпальванне сухой расліннасці. Як адзначыў **навуковы каардынатар праекта Міхаіл МАКСІМЕНКАЎ**, гэта мерапрыемства адрозніваецца ад звычайнага выпальвання строгім прытрымліваннем шэрагу правілаў, што дазваляе правесці яго з мінімальнай шкодай прыродзе. У выніку быў знішчаны трыснёг на плошчы 3,3 тысячы га і аздароўлены месцапражыванні вяртлявай чаротаўкі на плошчы 2,6 тысячы га. Усяго ж шчыльнасць папуляцыі гэтай птушкі на мадэльных участках заказніка «Званец» у параўнанні з пачаткам праекта вырасла ў 1,5—2 разы, у заказніку «Спораўскі» — у 1,2—1,5 раза.

Каб палепшыць экалагічны стан тэрыторыі і знізіць рызыку пажараў, на тэрыторыі заказніка «Званец» спецыялісты правялі таксама аднаўленне і аптымізацыю гідралагічнага рэжыму.

Нягледзячы на станоўчыя вынікі праекта, спецыялісты ўпэўнены: без працягу гэтай дзейнасці стан балот і іх жыхароў зноў пачне пагаршацца — станоўчы эфект пасля праведзеных мерапрыемстваў захоўваецца на працягу 2—3 гадоў. Акрамя таго, падтрыманне балот заказнікаў у натуральным стане дазволіць у доўгачасовай перспектыве дэпаніраваць 9,359 млн тон вугляроду і захаваць зыходныя запасы вугляроду ў іх на ўзроўні 360 т/га.

— Дзякуючы рэалізацыі гэтага і аналагічных праектаў, бачны станоўчая дынаміка і перспектывы работы для захавання біялагічнай разнастайнасці натуральных нізінных балот, — адзначыла **першы намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Ія МАЛКІНА.** — І гэту работу трэба працягваць — мяркуецца, што вынікі праекта могуць быць адлюстраваны ў нацыянальных праграмных дакументах.

Па словах **кіраўніка прадстаўніцтва Еўрапейскага саюза ў Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН**, у пілотных раёнах дасягнуты значныя эканамічныя, экалагічныя і энергетычныя вынікі. Так, напрыклад, былі створаны 33 працоўныя «зялёныя» месцы, 6 з іх — пастаянныя. Цяпер асноўная задача — зрабіць гэтыя вынікі ўстойлівымі і распаўсюдзіць іх на больш значныя тэрыторыі. Згодзен з ёй і пастаянны прадстаўнік ПРААН у Беларусі Санака Самарасінха.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор торгов:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г.Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 47-20-56.

| |
|---|
| **Продавец:** ОАО «Витебский плодоовощной комбинат», 211301, Республика Беларусь, Витебский район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д. 9 |
| **Наименование предмета торгов, начальная цена с учетом НДС, задаток** |
| Лот №1. Грузовой вагон Volkswagen LT35, 1992 г. в., гос. номер АА 0606-2. Начальная цена: 2 916 руб. Задаток: 291,60 руб. |
| Лот №2. Грузопассажирский вагон Hyundai H-200, 2001 г. в., гос. номер АЕ 1427-2. Начальная цена: 7 884 руб. Задаток: 788,40 руб. |
| Лот №3. Легковой джип Lada 21310-120-40, 2012 г. в., гос. номер 8896 ЕВ-2. Начальная цена: 7 560 руб. Задаток: 756 руб. |
| Лот №4. Грузовой фургон МАЗ 54329, г. в. не определен, гос. номер АВ 3493-2. Начальная цена: 8 208 руб. Задаток: 820,80 руб. |
| Лот №5. Автобус ПАЗ 32053, 2008 г. в., гос. номер АВ 3724-2. Начальная цена: 3 996 руб. Задаток: 399,60 руб. |
| Лот №6. Прицеп тракторный 2ПТС-4 1994 г. в., гос. номер 8450 БХ. Начальная цена: 2 592 руб. Задаток: 259,20 руб. |
| Лот №7. Вышка самоходная GS-2632, инв. №1257. Начальная цена: 13 284 руб. Задаток: 1 328,40 руб. |
| Лот №8. Смородоуборочный комбайн Jarek, инв. №4845. Начальная цена: 36 396 руб. Задаток: 3 639,60 руб. |
| Лот №9. Погрузчик Амкодор Е16, инв. №4872. Начальная цена: 21 276 руб. Задаток: 2 127,60 руб. |
| Лот №10. Вакуум-выпарная установка М32с-320, инв. №4861. Начальная цена: 3 240 руб. Задаток: 324 руб. |
| Лот №11. Вакуум-выпарная установка М32с-320/2, инв. №4862. Начальная цена: 3 240 руб. Задаток: 324 руб. |
| Лот №12. Вакуумно-выпарной аппарат МЗС 241А-1, инв. №4887. Начальная цена: 3 564 руб. Задаток: 356,40 руб. |
| Лот №13. Пресс, инв. №311. Начальная цена: 3 348 руб. Задаток: 334,80 руб. |
| Лот №14. Линия мойки 2105 А6446014101, инв. №1501. Начальная цена: 10 368 руб. Задаток: 1 036,80 руб. |
| Лот №15. Бланширователь А9КЕ, инв. №1573. Начальная цена: 2 916 руб. Задаток: 291,60 руб. |
| Лот №16. Чан, инв. №4791. Начальная цена: 2 592 руб. Задаток: 259,20 руб. |
| Лот №17. Транспортер этикеровочный (одноленточный – 2 шт., направляющий – 2 шт., роликовый – 1 шт.), инв. №1261. Начальная цена: 2 376 руб. Задаток: 237,60 руб. |
| Повторные торги состоятся 21.12.2017 в 11.00 по адресу: Республика Беларусь, Витебский район, аг. Новка, ул. Рудаковская, д. 9 в ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». |

Срок внесения задатка и подачи заявлений: с 05.12.2017 с 8.30 по 20.12.2017 до 17.30. Сумма задатка перечисляется на р/с BY41BELB30121214480040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, пр-т Победителей, 29, BIC BELBBY2X, УНП 300063727. Получатель платежа: ОАО «Витебский плодоовощной комбинат». Шаг аукциона устанавливается в сумме 5% от начальной цены лота. Начальная цена указана с учетом НДС. Условие аукциона: демонтаж и погрузка оборудования осуществляются за счет Покупателя

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. №415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр. лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 дней со дня проведения торгов: возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее, чем за 5 дней до даты их проведения. Имущество, выставляемое на торги, бывшее в употреблении. Ознакомление с объектами осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by

## Извещение о проведении 10 января 2018 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Радваничском сельском Совете Брестского района Брестской области

| № лота | Местоположение и кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. | Целевое назначение земельного участка | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, убытки (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Брестская обл., Брестский район, д. Малые Радваничи, ул. Брестская, 30 121283701101000568 | 0,1399 | 5000 | 500 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | 1. За изготовление земельно-кадастровой документации с установлением границ земельного участка – 620 рублей 07 копеек.<br>2. За государственную регистрацию земельного участка – 87 рублей 40 копеек.<br>3. За оформление градостроительного паспорта земельного участка – 563 рубля 56 копеек.<br>4. Возмещение убытков, связанных с нарушением функционирования мелиоративных сооружений, – 17 рублей 60 копеек.<br>5. Возмещение расходов на объявления – согласно акту выполненных работ после размещения |

Имеется возможность электрификации, газификации.

Аукцион будет проводиться **10 января 2018 г. в 11.00** по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (в здании сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление и предоставить копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Радваничского сельисполкома (BY61AKBB36410000002621000000, БИК AKBBB421100 в ф-ле №100 ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 200036035, код платежа 4901) суммы задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка, а также документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Для проведения аукциона необходимо наличие не менее 2 участников. Если аукцион признан несостоявшимся из-за того, что заявление на участие в нем подано только одним гражданином, земельный участок предоставляется этому гражданину при его согласии с внесением платы за предмет аукциона в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, возмещение убытков за нарушение функционирования мелиоративных систем, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский район, аг. Большие Радваничи, ул. Центральная, 94 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявления **4 января 2018 г. до 17.00.** Дополнительную информацию о земельном участке можно получить по телефонам: 93 11 35, 93 11 36, 93 11 30, 93 16 11.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18 |

**Предмет аукциона (имущество реализуется одним лотом).**
**Месторасположение: Минская обл., Червенский р-н, Смиловичский с/с, д. Старино**

| Наименование (составные части и принадлежности) | Общая площадь |
|---|---|
| **Цех деревообработки с административными помещениями** (инв. №615/С-35497), в том числе | 1027,1 кв. м |
| Вент. камеры 2 шт., рампа 2 шт., сети питьевого водопровода (а1) | 184,7 м |
| Сети бытовой канализации (а2) | 255,7 м |
| Сети ливневой канализации (а3) | 287,4 м |
| Очистные сооружения ливневой канализации (а4) | |
| Двухкамерный септик (а5) | |
| Поля фильтрации (а6) | 235 м |
| Покрытия (а7, а8, а9) | 6446 кв. м |
| **Склад** (инв. №615/С-35853), в том числе пристройка (1) | 150,6 кв. м |
| **КПП** (инв. №615/С-35856), в том числе | 7,6 кв. м |
| ограждение (А1) | 639,7 м |
| **ТП** (инв. №615/С-245) | 68,3 кв. м |
| **Водозаборная скважина** (инв. №615/С-35855), в том числе насос Grundfos | глубина – 30 м |
| **Насосная станция** (инв. №615/С-35496), в том числе | 25,2 кв. м |
| Два резервуара | 150 куб. м |
| Сети пожарного водопровода | 484,3 м |

**Иное имущество**

| **Инв. № по бух. учету** | **Наименование** |
|---|---|
| Входит в №0000801 | Сети электроснабжения (внутриплощадочные) |
| Входит в №0000980 | Комплект оборудования насосной |
| 0000831 | Котельная установка с комплектом оборудования |
| 0000803 | Силовой трансформатор |
| 0000804 | Силовой трансформатор |
| 0000830, 0000885 | Сушильные камеры с комплектом оборудования (тележка ТД-1250 с рельсами, вентиляторы – 3 шт., эл. шкаф) |
| 0001419 | Агрегат конденсатной сушки |
| 0001481 | Агрегат конденсатной сушки |
| 0000960 | Система противопожарной автоматики |
| 0000848 | Сумматор СЭМ-1 |
| 0000849 | Счетчик эл/эн Евро Альфа ЕА10RL P2C-4 |
| 0000850 | Счетчик эл/эн Евро Альфа ЕА10RL P2C-4 |
| 0000805 | Комплект низковольтного оборудования трансформаторной подстанции |

**Сведения о земельном участке**: пл. **2,5727 га** предоставлен продавцу на праве аренды по 20.11.2115 для обслуживания цеха деревообработки с административно-быт. помещениями, зданий и сооружений. Ограничения (обременения) – находится в охран. зонах электрич. сетей напряжением свыше 1000 В, пл. 0,2 га

**Начальная цена с НДС – 390 386 руб. 07 коп.**
(снижена на 50%)

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с №BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета аукциона:** 60% от цены продажи имущества с учетом ранее внесенной суммы задатка оплачивается в течение 10 (десяти) календарных дней со дня заключения договора купли-продажи, оставшаяся сумма оплачивается с рассрочкой платежа на срок до 6 (шести) месяцев

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by**

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звязда» 25.10.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Аукцион состоится 22.12.2017 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703. Заявления на участие и необходимые **документы принимаются по 20.12.2017 до 17.00** по указанному адресу. Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. **www.cpo.by**. Email: auction@cpo.by

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

| **Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов** | Аукцион состоится **20 декабря 2017 г. в 11.00** по адресу: Гомельская область, г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1)<br>Коммунальное унитарное предприятие по операциям с недвижимым имуществом «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью» | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Номер лота** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **Адрес земельного участка** | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 17 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 25 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 29 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 33 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Воинов-интернационалистов, 35 | Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Рассветная, 5 |
| **Кадастровый номер участка** | 321850100001002708 | 321850100001002712 | 321850100001002714 | 321850100001002716 | 321850100001002717 | 321850100001001995 |
| **Площадь, га** | 0,1076 | 0,1155 | 0,1426 | 0,1409 | 0,1390 | 0,1125 |
| **Целевое назначение** | Земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания). | | | | | |
| **Условия и ограничения** | Победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:<br>1. В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся:<br>– внести плату за право частной собственности земельного участка (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке);<br>– возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка;<br>2. После совершения победителем аукциона вышеуказанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, местный исполнительный комитет передает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.<br>3. Обеспечить в двухмесячный срок государственную регистрацию права частной собственности на земельный участок со дня утверждения протокола аукционных торгов по продаже земельного участка в частную собственность;<br>4. В течение двух месяцев со дня государственной регистрации права земельного участка получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство одноквартирного жилого дома;<br>5. Приступить к занятию земельного участка в течение одного года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации;<br>6. Снять, сохранить и использовать плодородной слой почвы согласно проектной документации;<br>7. Соблюдать права и обязанности иных землепользователей земельных участков;<br>8. Использовать земельный участок в соответствии с целевым назначением и условием его предоставления, согласно Кодексу Республики Беларусь о земле | | | | | |
| **Начальная цена, рублей** | 4 125 руб. 52 коп. | 4 428 руб. 41 коп. | 5 467 руб. 46 коп. | 5 402 руб. 28 коп. | 5 214 руб. 49 коп. | 4 183 руб. 31 коп. |
| **Сумма задатка, рублей** | 400 руб. | 400 руб. | 500 руб. | 500 руб. | 500 руб. | 400 руб. |
| **Затраты по изг. зем. документации, рублей** | 1 422 руб. 06 коп. | 1 448 руб. 88 коп. | 1 448 руб. 88 коп. | 1378 руб. 70 коп. | 1 441 руб. 62 коп. | 1 436 руб. 08 коп. |
| **Стоимость расходов по орг. и проведению аукциона (ориент.), рублей** | 300 руб. | 300 руб. | 300 руб. | 300 руб. | 300 руб. | 300 руб. |

Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия: участки свободны от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ).

Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: общие сети и сооружения инженерной инфраструктуры отсутствуют.

Примечание*: Согласно части первой пункта три Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 1 апреля 2014 г. №298, возмещение затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку производится лицом, которому в соответствии с законодательством предоставлен земельный участок, при возведении многоквартирных жилых домов, одноквартирных, блокированных жилых домов в районах (кварталах) индивидуальной жилой застройки, возведение иных объектов на территории застройки.

*При предоставлении затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку КУП «Управление капитального строительства Жлобинского района»

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. №462.

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) **по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по 18 декабря 2017 года включительно.**

Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Жлобинского районного исполнительного комитета, УНП 400013420, BY73 AKBB 3642 4180 4400 4320 0000, филиал №312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобина, БИК AKBBBY21312, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре.

Контактные телефоны: **8 (02334) 7 21 12, 7 53 01.**

Телефоны организатора аукциона: **8(02334) 3 14 08, 3 16 16.**

Извещения о проведении предыдущих аукционов были опубликованы в газете «Звязда» 24.05.2016 г. №96 (28206), 24.06.2016 г. №119 (28229), 30.07.2016 г. №145 (28255), 02.11.2016 г. №212 (28322), 26.11.2016 г. №229 (28339), 25.02.2017 г. №39 (28403), 25.05.2017 г. №97 (28461), 02.08.2017 г. №146 (28510).

**Полный текст извещения о проведении аукциона размещен на сайте Жлобинского райисполкома gisp.gov.by**

## Маргарыта ФЕФІЛАВА:

# «НЕРВОВЫМ ЛЮДЗЯМ НЕ МЕСЦА ЗА БІЛЬЯРДНЫМ СТАЛОМ»

### Як беларуская дзяўчына ўпершыню ў гісторыі ўзначаліла еўрапейскі рэйтынг у адной з самых папулярных разнавіднасцяў більярда — пуле

**Калі Маргарыта Фефілава пачала выступленні ў Еўратуры, то ўваходзіла толькі ў другую сотню гульцоў кантынента, але паступова дабралася да вяршыні і на гэтым не спыняецца. Як 20-гадовая мінчанка абыгрывае мужчын, хто стаіць за яе поспехамі і чаму азіяты — гэта робаты ў многіх відах спорту, Маргарыта расказала ў сваім інтэрв'ю «Звяздзе».**



#### У нас на лецішчы заўсёды стаяў більярдны стол

Таму гулялі ўсе — бацькі, бабуля з дзядулем. Калі я была маленькая, увесь час поўзала па стале і рукамі заганяла шарыкі ў лузы, а потым нейк абыграла дзядулю, які быў у нас самы дасведчаны аматар більярда. Цяпер мне 20, сур'ёзна я займаюся гэтым відам спорту ўжо гадоў шэсць. У 2012-м упершыню паехала на юніёрскі чэмпіянат Еўропы, убачыла, які там узровень, зразумела, да чаго трэба імкнуцца, усвядоміла, што яшчэ трэба патрэніравацца, папрацаваць, і магчымасць паказаць добры вынік у мяне з'явіцца.

Потым у більярд прыйшлі і мае бацькі, яны ўзначалілі кірункі пула ў беларускай асацыяцыі більярда, пачалі развіваць гэты кірунак. Хоць да гэтага тата цікавіўся гэтым відам спорту толькі на аматарскім узроўні, а мама была педагогам-псіхолагам. У выніку ў нас утварылася вось такая каманда.

#### Цяпер мой трэнер — тата

Да таго як прыняць такое рашэнне, спрабавалі шмат трэнераў, але не знайшлі спецыяліста для таго ўзроўню, на якім я выступаю. Вядома, гэта складана, калі тата не толькі твой бацька, але і трэнер. Спачатку ў нас было шмат канфліктаў, я не магла знайсці грань паміж гэтымі двума паняццямі. Але два гады таму мы вырашылі памяняць усю сістэму і выбудаваць дакладны падзел: дом — гэта дом, трэніроўка — гэта трэніроўка. Цяпер паняцці «тата» і «трэнер» не перасякаюцца. Недзе і яму хочацца пашкадаваць мяне, даць адпачыць дачцэ, але з пункту гледжання трэнера ён разумее, каб дасягнуць выніку, трэба шмат працаваць.

Звычайна я трэніруюся тры гадзіны ў дзень, 5—6 разоў на тыдзень, калі гэта напярэдадні буйных спаборніцтваў, то можа быць і па дзве трэніроўкі ў дзень. Раз у тыдзень гуляю са спарынг-партнёрам, там ужо адпрацоўваю атрыманыя навыкі.

#### Складана вылучыць самы галоўны кампанент

Як і любы спорт, гэта комплекс, што складаецца з фізічных нагрузак, псіхалогіі і іншых ведаў. З боку здаецца, нібыта ў більярдзе няма асаблівых фізічных намаганняў, на самай справе ў нас вельмі важна быць вынослівым. Адзін матч можа доўжыцца да трох гадзін, падчас яго ты ходзіш вакол стала, чакаеш, пакуль сапернік скончыць свой падыход, а за дзень можна згуляць 4—5 матчаў, пры гэтым на працягу ўсяго часу неабходна захоўваць канцэнтрацыю. Вядома, у мяне няма неабходнасці цяжкай работы ў трэнажорнай зале, але агульная фізічная падрыхтоўка павінна быць. Я, напрыклад, каб пастаянна трымаць сябе ў тонусе, бегаю раніцай. Перыядычна здараюцца такія марафоны, як чэмпіянат Еўропы, што доўжыцца два тыдні, да гэтага трэба быць гатовым.

З псіхалагічнага пункту гледжання самае складанае — захоўваць канцэнтрацыю і верыць у сябе, нават калі ты прайграеш 0:4 у матчы да пяці перамог.

Да таго ж у нашым відзе спорту пастаянна трэба думаць, пралічваць варыянты, пры тым не на адзін крок наперад, а бачыць усю пазіцыю ў комплексе, нездарма кажуць, што більярд — гэта шахматы ў руху. Свае дзеянні трэба пралічваць на 6—8 крокаў.

#### Більярд — адзін з самых інтэлігентных відаў спорту

Тут заўсёды трэба захоўваць спакой, для мяне гэта не складана, бо па характары я спакойны чалавек, можа быць, таму і дасягнула такіх поспехаў. Нервовым людзям не месца за більярдным сталом, тут патрэбен «покерфейс» і поўны кантроль эмоцый, ад гэтага залежыць вынік. Сустракаюцца нервовыя гульцы, але ў більярдзе недапушчальна стукаць кіем па стале ці ў гневе рабіць рэзкія рухі. Суддзя робіць два папярэджанні, а пасля трэцяга гулец атрымлівае дыскваліфікацыю.

Більярдысты заўсёды акуратна апранутыя: аднатонная майка пола альбо кашуля, штаны чорнага колеру і класічныя чорныя туфлі. Дзяўчыне не павінны перашкаджаць валасы, таму што, напрыклад, калі яны ўпалі на шар, гэта лічыцца парушэннем.

#### Сітуацыя сёння мяняецца

З'яўляецца шмат школ, якія выхоўваюць моладзь, на спаборніцтвах унутры краіны стала ўдзельнічаць па 100 чалавек — гэта неверагоднае дасягненне для беларускага більярда. Калі я толькі пачынала займацца, на чэмпіянаце Беларусі выступала па 10—12 чалавек. Цяпер з'яўляецца не толькі масавасць, але і ўзровень гульцоў расце, канкурэнцыя павялічваецца.

Я нядаўна перайшла ў дарослы спорт, прызнаюся, было страшна, бо часта маладыя гульцы губляюцца, не вытрымліваюць канкурэнцыі. У мяне ўсё склалася добра, як толькі я перайшла на дарослы ўзровень, пачала паказваць добрыя вынікі. У 20 гадоў прыйшла стабільнасць, з'явіліся дарослыя думкі, дзякуючы якім стала лягчэй трэніравацца.

#### Адным більярдам не заробіш

Таму ўсе гульцы маюць іншую працу. Я не разглядаю іншую сферу дзейнасці, мне падабаецца быць спартсменам і паралельна трэніраваць дзяцей. У нас з бацькамі ёсць свая школа більярда, я працую там, вучуся на 3-м курсе БДУФК, таму ёсць магчымасць усё гэта сумяшчаць. Вельмі падабаецца тое, чым я займаюся. Калі пачала працаваць з маладымі спартсменамі, на свае трэніроўкі стала глядзець па-іншаму.

#### Гэта від спорту, які дазваляе спаборнічаць дзяўчатам з мужчынамі

Я выйграла два мужчынскія чэмпіянаты краіны, пасля гэтага прадстаўнікі моцнага полу пачалі казаць пра тое, што трэба было б забараніць жанчынам удзел у мужчынскіх спаборніцтвах. Хоць, калі мне было 12—13 гадоў, мужчыны не хавалі задавальнення і радасці ад перамогі нада мной.

Але ж мне падабаецца гуляць з мужчынамі, у іх іншая стыль, мысленне. Жанчыны ў прынцыпе непрадказальныя, так і ў гульні: ад іх не ведаеш чаго чакаць, а мужчыны больш дзейнічаюць па шаблонах, па класіцы.

Яшчэ більярд цікавы тым, што ў нас няма ўзроставых абмежаванняў, можна гуляць і дзіцяці ў 10 гадоў і чалавеку ў 60. Таксама ў нас праходзяць турніры для інвалідаў-калясачнікаў. Адзначу, што мала хто ведае, але більярд з'яўляецца алімпійскім відам спорту, проста ён пакуль не ўключаны ў алімпійскую праграму.

#### Для мяне самае значнае дасягненне

Гэта перамога на двух Еўратурах і першае месца ў еўрапейскім жаночым рэйтынгу па выніках года. Я доўга да гэтага ішла, з 2015 года пачала ездзіць на спаборніцтвы Кубка Еўропы, спачатку абсалютна беспаспяхова. Тады была ў рэйтынгу дзесьці на 136-м месцы, праз год на 34-м, потым на 17-м, 9-м, доўгі час трымалася на 5-м радку. У жніўні выйграла Еўратур у Галандыі (гэта быў самы шматлікі Еўратур за апошні час), потым атрымала перамогу ў Партугаліі і паднялася на 1-е месца ў рэйтынгу.

Думала, што зведаю нейкія асаблівыя пачуцці ад першай перамогі на такім турніры, а аказалася, што ўспрыняла гэта досыць спакойна. У жыцці наогул нічога не змянілася, хоць гэтая перамога — сапраўды высокае дасягненне. Можа быць, калі б такое здарылася са мной у 16, усё было б па-іншаму, а цяпер я разумею, што гэта не тое дасягненне, на якім трэба спыняцца. Гэта толькі прамежкавы этап і яшчэ адна прыступка ў дасягненні сваёй мэты.

Першае месца ў рэйтынгу дало мне некаторыя дывідэнды. Першая чацвёрка еўрапейскага рэйтынгу запрашаецца на асноўныя этапы усіх чэмпіянатаў свету і рэйтынгавых сусветных спаборніцтваў. Гэта значыць, мне не трэба праходзіць кваліфікацыю. Арганізатары пачалі запрашаць на міжнародныя спаборніцтвы ў Кітай і Тайвань на добрых умовах, беручы на сябе частковую аплату пералётаў, гасцініц, узносаў, а раней усё трэба было аплачваць самім.

#### Самы прэстыжны турнір

Гэта чэмпіянат свету. Паміж узроўнем Еўропы і свету вельмі вялікая розніца, таму што азіяты ў більярдзе сёння знаходзяцца на неверагодным узроўні. У кастрычніку я гуляла з адной з самых тытулаваных кітаянак, яна проста робат. У іх працаздольнасць неверагодная. Да таго ж вельмі важна, што ў кожнай сярэдняй школе ў іх стаіць більярдны стол, гэта як урок фізкультуры, ён уключаны ў школьную праграму. Зразумела, што хоць бы адно дзіця са школы працягне кар'еру ў більярдзе і даб'ецца добрых вынікаў.

У будучыні, мне, вядома, хацелася б выйграць чэмпіянат Еўропы, але канчатковая мэта — Кубак свету і сусветны рэйтынг. Ведаю, што будзе складана, але галоўнае — пачаць.

---

# У такіх момантах каманда расце

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра выніці першага этапу Кубка свету па біятлоне, гульнях гандбольнага БГК і баскетбольнага «Цмокі-Мінск».**

**1.** ***Завяршыўся першы этап Кубка свету па біятлоне.*** Цяпер у агульным заліку найлепшай з беларусак з'яўляецца Надзея Скардзіна, яна займае трэцяе месца. Нагадаем, спартсменка ў шведскім Эстэрсундзе стала пераможцай індывідуальнай гонкі, у спрынце была 12-й і заняла 6-е месца ў гонцы праследавання.

Дар'я Домрачава знаходзіцца на 33-м месцы (27 ачкоў), Ірына Крыўко займае 39-ю пазіцыю (22), Надзея Пісарава — 52-ю (8), Дар'я Юркевіч — на 54-й пазіцыі (5). Агульны залік узначальвае француженка Жусцін Брэза.

У мужчын у лідарах дзеючы пераможца Кубка свету, шасціразовы ўладальнік Хрустальнага глобуса француз Мартэн Фуркад. З беларускіх страляючых лыжнікаў заліковыя балы мае толькі Раман Ялётнаў. Іх у яго ўсяго 8, што адпавядае 44-й пазіцыі ў агульным заліку. Старшы трэнер мужчынскай каманды Васіль Бальшакоў адзначыў, што склад мужчынскай зборнай Беларусі па біятлоне на другі этап Кубка свету будзе зменены. На Кубак IBU адпраўяцца Уладзімір Чапелін і Сяргей Бачарнікаў, замест іх кампанію Раману Ялётнаву і Максіму Вараб'ю складуць Аляксандр Дарожка і Віктар Крыўко, каб палепшыць умовы для павышэння іх спаборніцкага статусу.

Другі этап Кубка свету пройдзе ў наступныя выхадныя ў аўстрыйскім Хахфільцэне. У яго праграму ўключана 6 стартаў:

8 снежня — спрынтарскія гонкі (мужчыны — 10 км, жанчыны — 7,5 км);

9 снежня — гонкі праследавання (мужчыны — 12,5 км, жанчыны — 10 км);

10 снежня — эстафеты (мужчыны — 4х7,5 км, жанчыны — 4х6 км).

**2.** ***Гандбалісты БГК імя Мяшкова спынілі серыю з чатырох паражэнняў у групавой стадыі Лігі чэмпіёнаў, абыграўшы дома славенскі «Цэле» 29:24.***

*— Матч быў важны для абедзвюх камандаў. Адчувалася напружанне. На нас ляжала вельмі вялікая адказнасць пасля чатырох прайграных матчаў у Лізе чэмпіёнаў. Хлопцы моцна настроіліся. Гэта тлумачыла тое, што ў першыя дзесяць хвілін было забіта ўсяго пяць мячоў абедзвюма камандамі. Наша дружына славіцца тым, што ў цяжкія моманты хлопцы ўмеюць сабрацца і выйграць. Гэта вельмі важна. У такіх момантах каманда расце,* — расказаў пасля матча **галоўны трэнер БТК Сяргей БЯБЕШКА.**

Тым часам вызначыліся ўсе сапернікі гандбалістаў мінскага СКА па групавой стадыі Кубка ЕГФ. Уладальнікам апошняй пуцёўкі ў групу «А» стаў славацкі «Татран». Жараб'ёўка таксама вызначыла ў сапернікі мінскаму СКА дацкі «Б'ерынгбро» і нямецкі «Магдэбург».

Першы матч СКА згуляе дома 10 або 11 лютага з «Магдэбургам».

**3.** ***Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» пацярпелі другое паражэнне запар у матчах Адзінай лігі ВТБ.*** На выездзе мінчане саступілі краснадарскаму клубу «Лакаматыў-Кубань» — 56:67. У складзе «цмокаў» самым выніковым стаў капітан каманды Аляксандр Кудраўцаў, які набраў 12 ачкоў.

Нагадаем, у папярэднім паядынку «банкаўскага» турніру падапечныя Аляксандра Круцікава прайгралі ў Мінску саратаўскаму «Аўтадару» 82:86. У васьмі матчах Адзінай лігі ВТБ чэмпіёны Беларусі атрымалі 3 вікторыі пры пяці паражэннях. Сваю наступную гульню яны правядуць 10 снежня на паркеце «Мінск-Арэны» супраць талінскага «Калева», які ў сямі сустрэчах перамог толькі аднойчы

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Вандроўныя нататкі

# ПРАСТОРА МУЗ

## Чым жыве слынная радзіма беларускіх мастакоў парыжскай школы?

**Мястэчка Смілавічы, што ў Чэрвеньскім раёне, падарыла свету шмат таленавітых людзей — Агінскіх, Манюшкаў, Ваньковічаў. Адсюль таксама паходзілі мастакі Хаім Суцін і Шрага Царфін. Тут нарадзіліся і правялі дзяцінства вядомы польскі інжынер і вынаходнік Ян Юзаф Бараноўскі, выдатныя савецкія навукоўцы — біяхімік Іосіф Рынга і мікрабіёлаг Сямён Фрыд. Таксама бліскучы беларускі гісторык Ібрагім Канапацкі, параалімпійская чэмпіёнка Людміла Волчак і многія іншыя ў свой час жылі тут. Сёння Смілавічы — месца, якое вабіць турыстаў. Найперш музеем «Прастора Хаіма Суціна». Сюды завітваюць не толькі каб палюбавацца карцінамі выдатных мастакоў, але і каб выпіць кубачак кавы ў стылізаванай «Парыжскай кавярні». Зусім нядаўна ў Смілавічах адкрылася Музычная гасцёўня Станіслава Манюшкі, дзе можна пачуць у жывым выкананні музыку вялікага кампазітара. Мы паспрабавалі ўбачыць і адчуць, чым яшчэ цікавыя Смілавічы...**

### «Зорныя» ўладальнікі

Згадкі пра Смілавічы можна знайсці ва ўсіх буйных энцыклапедыях свету дзякуючы таму, што тут нарадзіўся сусветна вядомы творца Хаім Суцін — мастак парыжскай школы, расказвае **дырэктар культурнай установы «Спадчына і час», кіраўнік праекта «Развіццё турыстычнага патэнцыялу мястэчка Смілавічы» Юрась АБДУРАХМАНАЎ**. Упершыню яны згадваюцца ў 1592 годзе як мястэчка ў складзе Вялікага Княства Літоўскага. Смілавічы належалі Кізгайлам, затым імі валодалі Сапегі, Завішы, Агінскія, Манюшкі, Ваньковічы. Варта крыху спыніцца на асобе Марцыяна Агінскага, які жыў у канцы XVII стагоддзя. Ён пабудаваў замак у Смілавічах, абнёс яго валамі. Менавіта ён заснаваў і пабудаваў праваслаўную Свята-Траецкую царкву ў 1668 годзе. Аднак, каб займець магчымасць атрымліваць найвышэйшыя пасады ў Вялікім Княстве Літоўскім, у 1669 годзе перайшоў у каталіцтва.

Цікава, што зусім нядаўна гісторыкі знайшлі доказы таго, што на знакамітым палатне Рэмбранта «Польскі вершнік», якое сёння знаходзіцца ў Злучаных Штатах Амерыкі, выяўлены менавіта Марцыян Агінскі. У 1767 годзе ў Смілавічах быў заснаваны рыма-каталіцкі манастыр і касцёл Святога Вінцэнта. Пасля смерці Марцыяна яго ўдава працягнула такі кірунак дзеяннняў. Значныя сродкі ў развіццё манастыра, які, на жаль, не захаваўся (быў разбураны ў 1930-х гадах), таксама ўкладаў Міхал Казімір Агінскі — мецэнат, паэт, кампазітар. У сутарэннях касцёла хавалі спачатку Агінскіх, затым Манюшкаў. Аднак ніякіх слядоў да нашага часу не дайшло.




Усё, што мы маем, каб уявіць веліч колiшніх касцёла і манастыра, — гэта акварэль Напалеона Орды, зробленая ў 1870-х гадах.

### Шматэтнічнасць і шматканфесійнасць

Манюшкі сталі валодаць Смілавічамі ў 1791 годзе. Будучы кампазітар Станіслаў Манюшка, чыя сям'я жыла непадалёк, часта бываў у смілавіцкім маёнтку дзядзькі. Свае



Кіраўнік музея «Прастора Хаіма Суціна» Святлана КАСІНЕВІЧ расказвае пра карціну Шрагі Царфіна «Натоўп».

юнацкія ўражанні пра гэта месца ён прадставіў у оперы «Страшны двор». З 1793 года, пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, Смілавічы ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі. Асаблівасцю гэтага мястэчка, як і многіх іншых у Беларусі, была поліэтнічнасць і поліканфесійнасць. Тут здаўна жылі хрысціяне — як праваслаўныя, так і каталікі — а таксама мусульмане і іўдзеі. Татары пасяліліся тут каля 600 гадоў таму. Яны прыбылі сюды па запрашэнні ўлад Вялікага Княства Літоўскага і прынеслі з сабой шмат рамёстваў, у прыватнасці скураную справу.

Па матэрыялах перапісу канца XVIII стагоддзя, праведзенага расійскімі ўладамі, у Смілавічах, якія толькі што перайшлі ў валоданне Станіслава Манюшкі, налічвалася 85 двароў і 564 жыхары.

Варта адзначыць, што татарская слабада па-ранейшаму існуе ў Смілавічах на левым беразе Волмы. Там дзейнічае мячэць. Але да канца XIX стагоддзя Смілавічы зрабіліся сапраўдным штэтлам, яўрэйскае насельніцтва было ў мястэчку самым шматлікім — каля 80% усіх жыхароў. На жаль, гітлераўскія акупанты, прыйшоўшы сюды ўжо ў верасні 1941 года, многіх знішчылі ў смілавіцкім гета. Каля 2000 жыхароў было расстраляна.

Трэба адзначыць, што менавіта яўрэі прынеслі ў мястэчка ўменне працаваць з воўнай, рабіць валёнкі. Смілавіцкая валюшная фабрыка, якая існуе па сённяшні дзень, у свой час была арганізавана на базе яўрэйскай валюшнай арцелі.

### Унікальны фрагмент торы

На сёння адно з самых цікавых месцаў для наведвання — гэта музей «Прастора Хаіма Суціна», які быў заснаваны ў 2008 годзе дзякуючы падтрымцы ЮНЕСКА. У музеі працуе некалькі залаў. Адна з іх стылізавана пад «Парыжскую кавярню». Другая прысвечана ўласна мастаку. Трэцяя зала змяшчае творы яшчэ аднаго вядомага майстра парыжскай школы — Шрагі Царфіна.

Як расказала **кіраўнік музея «Прастора Хаіма Суціна» Святлана КАСІНЕВІЧ**, у адной з залаў музея можна давядацца пра дзіцячыя гады Хаіма Суціна. Дом, дзе будучы творца жыў з бацькамі, не захаваўся. Таму для музея прафесійна аднаўлялі атмасферу тых часоў. Змешчана акурат такая мэбля, якая магла быць і ў часы Хаіма Суціна. Цікава ўбачыць аўтэнтычную шафу надзвычай прадуманай канструкцыі. Хоць яна і была зроблена ў пачатку XX стагоддзя, у яе ўманціраваны перасоўныя вешалкі, якія рухаюцца па ўсёй прасторы шафы, асобна зроблена тумба для абутку. У шафе можна ўбачыць і вопратку тых часоў.

У музеі змяшчаецца досыць рэдкі экспанат — фрагмент торы. Хтосьці мяркуе, што яна створана ў XVIII стагоддзі. Магчыма, гэту тору чытаў бацька Хаіма Суціна. Яна знаходзілася ў сінагозе ў Смілавічах, а бацька мастака быў вельмі рэлігійным чалавекам, часта наведваў сінагогу і нават падпрацоўваў там пэўны час.

Тора ўручную напісана на пергаменце — і ў яе ёсць свая гісторыя. Падчас вайны ў Смілавічах адбылася страшная трагедыя — забілі шмат мясцовых жыхароў, яўрэйскія дамы абрабавалі. Але лёс торы аказаўся больш шчаслівы, чым лёс яе ўладальнікаў. Яна знайшлася праз 60 гадоў пасля вайны. Жыхар аднаго з мясцовых дамоў і сам не ведаў, што ў яго на гарышчы знаходзіцца такі рарытэт. Ён выкарыстоўваўся як уцяпляльнік — скруткамі было засланае гарышча, а зверху быў насыпаны 50-сантыметровы слой друзу. Калі тора выявілася, з яўрэйскага музея прыехала цэлая экспедыцыя, каб працаваць з ёй. Дарэчы, калі склалі ўсе скруткі, то атрымліваецца 30 метраў даўжыні! У выніку адзін скрутак падарылі музею «Прастора Хаіма Суціна», другі — музею Мірскага замка. А астатняя тора знаходзіцца ў яўрэйскім музеі.

### «Мой дарагі брат...»

У музейнай зале ёсць і радавод Суціна: між іншым, у яго сям'і было 11 дзяцей. Да апошняга часу не былі вядомыя імёны ўсіх братоў і сясцёр мастака, бо яны раз'ехаліся па свеце. Пра тое, што чацвёра жывуць у Амерыцы, стала вядома не так даўно, калі ў Смілавічы завітаў унук сястры Хаіма Мэры. Але лёс усіх братоў і сясцёр і да гэтага часу застаецца нявызначаным. Дакладна вядома, што малодшая сястра заставалася жыць у Смілавічах. Захаваўся яе ліст да брата: «Мой дарагі брат. Твае навіны даюць нам сілы жыць. Мы вечна будзем помніць падарунак, які ты нам зрабіў. Мама таксама дала нам грошы...» Гэта сведчанне, што мастак не толькі памятаў пра сваю сям'ю, але і дапамагаў ёй.

Бацька Суціна быў краўцом. Таму ў музеі прадстаўлены кравецкі рыштунак пачатку XX стагоддзя — швейная машынка, прас, сукно.

Прадстаўлены і куток фотаатэлье са старадаўнім фотаапаратам. Калі Хаім Суцін вучыўся ў Мінску, ён падпрацоўваў у такім атэлье рэтушорам. У гэтай музейнай экспазіцыі, дарэчы, вельмі любяць фатаграфавацца наведвальнікі, бо фотаатэлье ўдала перадае дух мінулай эпохі.

### Арыгінальныя карціны мастака

Яшчэ адна музейная зала прысвечана Шрагу Царфіну. У часовае экспанаванне тут прадстаўлена некалькі работ з калекцыі Белгазпрамбанка. Ёсць і работы, якія належаць самому музею, — гэта пяць арыгінальных твораў Шрагі Царфіна. Іх падарыла дачка мастака Ліліян Дзюлак. Памятаючы, што бацька ўспамінаў пра Смілавічы як пра любімае месца на Зямлі, яна не магла не зрабіць такі каштоўны падарунак. Сярод карцін, падораных ёю, работы «Лета» і «Букет». Акрамя таго, дачка прэзентавала апошнюю арыгінальную палітру бацькі, якая цяпер таксама прадстаўлена ў экспазіцыі.

Вядомы французскі калекцыянер Эмануэль Рампіно, у якога было 84 работы Царфіна, дзве з іх падарыў музею. Гэта даволі рэдкія карціны. Бо нават у сям'і Царфіна не захавалася работ даваеннага ці ваеннага часу, а тая, што змешчана ў Смілавічах, датуецца 1943 годам.

Колькасць турыстаў у Смілавічах істотна вырасла ў апошнія гады. Важна было палепшыць турыстычную інфраструктуру, што і было зроблена ў межах праекта «Развіццё турыстычнага патэнцыялу мястэчка Смілавічы», які падтрымліваецца Еўрапейскім саюзам.



Карта смілавіцкіх славутасцяў.

Былі ўсталяваны інфармацыйныя дарожныя шчыты, што дапамагаюць гасцям мястэчка лепш арыентавацца ў прасторы і знаходзіць цікавыя мясцовыя гістарычныя аб'екты. Гэтыя паказальнікі стаяць на трасе М4. Акрамя таго, у цэнтры пасёлка на сцяне ў стылі графіці выяўлена турыстычная карта Смілавічаў, на якой пазначаны славутасці. Такую ж карту можна атрымаць і ў раздрукаваным выглядзе.

З'явілася два прыгожыя камплекты паштовак, прысвечаных Хаіму Суціну, Шрагу Царфіну і Смілавічам увогуле. У самім мястэчку размешчаны інфармацыйныя шчыты, на якіх гараджане цяпер могуць знайсці інфармацыю пра значныя культурныя падзеі, што ладзяцца паблізу іх.

Пару гадоў таму ў Смілавічы прыязджала група ізраільскіх валанцёраў, якія дапамаглі адшукаць месцы захавання бацькі Хаіма Суціна і дзеда Шрагі Царфіна на старых яўрэйскіх могілках, — побач з надмагільнымі камянямі ўстаноўлены адпаведныя шыльды. Дарэчы, ва ўсіх англамоўных даведніках сцвярджаецца, што бацькі Хаіма Суціна загінулі ў гета. Аднак гэта няпраўда — насамрэч яны памерлі ў 1930-х гадах.

Праведзена добраўпарадкаванне тэрыторыі. Мясцовая моладзь дапамагала высаджваць дрэвы і кустоўе (з'явілася 150 новых раслін).

Мясцовыя жыхары мараць зрабіць Смілавічы арт-гарадком, дзе б працавала некалькі галерэй, праходзілі б міжнародныя выстаўкі і пленэры, магчыма фестывалі. Усіх зацікаўленых заклікаюць далучацца.

Яшчэ адну карціну — «Натоўп» — з асабістай калекцыі музея падарыла сям'я Віктара Бабарыкі. Шматлікія твары то губляюцца, то зноў бачацца на рознакаляровым палатне...

* * *

Смілавічы — адно з яскравых беларускіх мястэчак, якое захоўвае ў сабе і фарбы шматканфесійнай культуры, і мазкі беларуска-французскага мастацтва, і нават гукі музыкі самога Станіслава Манюшкі! Дзе яшчэ ўбачыш і пачуеш такое?

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*
*Чэрвеньскі раён*

■ Сваімі словамі



# На кім трымаецца свет?

**Настаўнік гісторыі і экскурсавод**

**Усё вялікае пачынаецца з малога — я ў гэтым цвёрда пераканана. І, як бы пафасна гэта ні гучала, звычайныя школьныя настаўнікі закладваюць падмурак будучыні нашага грамадства. Наколькі яны здольныя любіць сваіх вучняў і верыць у іх сілы? З якой увагай і цярплівасцю данясуць свой прадмет? Урокі беларускай мовы і літаратуры, напрыклад, можна любіць ці ненавідзець толькі праз тое, які настаўнік табе гэтыя прадметы выкладаў. Тое ж і з гісторыяй Беларусі. Пасеяць зерне сапраўднай любові да сваёй краіны, ашчадна пеставаць маладыя парасткі будучага патрыятызму... У прыватнасці, так было са мной. Любоў да гэтых прадметаў, закладзеная яшчэ ў падлеткавым узросце, жывая і сёння. Школа была домам, у якім расказвалі прапісныя ісціны, чаго не скажаш пра ўніверсітэт — туды, зрабіўшы асэнсаваны выбар, трапляеш як у вялікі дарослы свет, дзе ўжо вучышся жыць сам.**

Маю школьную настаўніцу гісторыі завуць Жанна Мечаславаўна Цімчанка. Яна выкладала і прадмет «Чалавек. Грамадства. Дзяржава». На ўроках настаўніца прыгадвала гістарычных асоб, якія насамрэч любілі свой край, ахвяравалі дзеля яго жыццём. Яна расказвала, што любіць Радзіму, рабіць нешта добрае дзеля яе росквіту — гэта наш непасрэдны абавязак — і сумненняў у гэтым не было ніякіх.

З урокаў ЧГД я дагэтуль памятаю, што такое прэзумпцыя невінаватасці — гэта права чалавека лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не даказана ў судзе... Як жа важна памятаць пра гэтую самую прэзумпцыю ў сучасным грамадстве, дзе людзі так часта абвінавачваюць адзін аднаго, з лёгкасцю прад'яўляюць прэтэнзіі, свабодна кідаюць камяні ў агарод іншага, не заўважаючы бервяна ва ўласным воку... Але ж у кожнага чалавека ёсць права лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не даказана ў судзе!.. Падаецца, у гэтым, цалкам юрыдычным прынцыпе, пра які можна даведацца яшчэ ў школе, закладзена і найвышэйшая чалавечая мараль, і евангельская ісціна — «не судзі»...

Дзякуючы настаўніцы гісторыі наша паралель пастаянна ездзіла ў цікавыя экскурсіі па Беларусі. Памятаю, з якой цікавасцю мы аглядалі руіны Крэўскага замка, як спыняліся каля помніка Мацею Бурачку (Францішку Багушэвічу) — заможнаму юрысту, які бараніў інтарэсы бедных сялян, аўтару слоў «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі». Прыгадваюцца і неймавернай прыгажосці вітражы ў касцёле з чырвонай цэглы, назва якога не засталася ў памяці... Але найбольш уразіла вандроўка ў Гальшанскі замак. А дакладней, у манастыр, што знаходзіцца паблізу. Там можна было пачуць шчымліва-трагічную гісторыю пра будаўніцтва манастыра. Пры ўзвядзенні адна з яго сцен увесь час рушылася. Будаўнікі палічылі патрэбным прынесці ахвяру і вырашылі: чыя жонка першай прынясе мужу на будоўлю абед, тую і замуруюць унутр. Як жа ў думках хваляваўся, моўчкі звяртаючыся да сваёй каханай, самы малады мужчына, які толькі ажаніўся, каб не яна першай прынесла абед... Але акурат яго жонка, шчаслівая і ўзрадаваная, несла мужу полудзень... Пасля зробленай ахвяры сцяна больш не трэскалася, і дабудаваны манастыр здалі ў належны тэрмін. Толькі прывід прыгожай маладой паненкі пачаў блукаць у новазбудаваным муры. Але гэта яшчэ не канец жахлівай гісторыі! Ужо ў наш час — у сярэдзіне 90-х — у манастыры ладзілі перабудову. У адной са сцен знайшлі чалавечы шкілет. Яго вывезлі і перазахавалі на могілках.

А сцяна тая... зноў пачала развальвацца — па ёй пайшла глыбокая трэшчына. Хацелі спешна вярнуць косткі на месца, аднак і будаўнік той, і кіроўца машыны, як высветлілася, ужо памерлі. Таму ні кутоў завязаць, ні кропак паставіць у гэтай гісторыі не ўдалося.

Дагэтуль памятаю, як расказвалі пра таямнічы пакойчык у тым жа манастыры. Кажуць, уночы наведвальнікаў, якія спыняліся ў ім, апаноўваў страх. Яны пачыналі шукаць выключальнік, каб запаліць святло, ці дзверы, каб пакінуць памяшканне, аднак, як ні стараліся, знайсці выйсце ці нейкі паратунак у гэтай келлі так і не ўдавалася... Яшчэ прыгадваюцца велізарныя драўляныя галовы, што стаялі непадалёк у калідоры, каля печы, пафарбаванай у сярэбраны колер. А ў сутарэннях, у музеі, былі надзвычай прыгожыя металічныя фігуркі.

Мне было гадоў чатырнаццаць, калі мы ездзілі ў тую экскурсію, якая так моцна запомнілася. Я добра ўсвядоміла, што вось такое яно, загадкавае, прывабнае, у нечым чароўнае наша мінулае. З вялікім жалем некалькі гадоў таму я даведалася, што філіял музея ў Гальшанскім кляштары ўжо не дзейнічае. А як жа драўляныя галовы? А што з патрэсканай сцяной? І ці не страціў, адсырэўшы, сваіх таямнічых уласцівасцяў той містычны пакойчык?..

